



# МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## да фільма “Алена Драпкіна: яўрэйская партызанка”



АЛЕНА ДРАПКІНА (МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, 1944)



АЛЕНА ДРАПКІНА (МІНСК, 1940)

IBB Internationale Bildungs- und Begegnungsstätte „Johannes Rau“ Minsk

Гістарычная майстэрня

centropa

МІНСК 2022

Фільм “Алена Драпкіна:
яўрэйская партызанка”

Прамая спасылка на матэрыялы
пра Алену Драпкіну на сайце

Працы ўдзельнікаў конкурсу планаў урокаў
па тэме «Выкладанне яўрэйскай гісторыі
XX стагоддзя ў Беларусі» (з выкарыстаннем
фільма пра Алену Драпкіну)

**Метадычныя матэрыялы да фільма “Алена Драпкіна: яўрэйская партызанка” /**
аўт.-склад. І.П. Бернат [і інш.]. — Мн., 2022. — 44 с.

У дапаможніку прадстаўлены дыдактычныя магчымасці выкарыстання ў адукацыйным працэсе фільма “Елена Драпкина: еврейская партизанка”, прысвечанага лёсу вязня Мінскага гета. У выданні прыведзены прыклады планаў-канспектаў заняткаў і розныя суправаджальныя матэрыялы, адрасаваныя настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства, а таксама ўсім, хто цікавіцца сучаснымі падыходамі ў выкладанні гісторыі Другой сусветнай вайны.

Біяграфічныя здымкі з біяграфіі Алены Драпкінай ©Centropa

Калі ў Вас узнікнуць пытанні па метадычных матэрыялах, просьба пісаць на электронную пошту info.gwminsk@ibb.by.

# ПАВАЖАНЫЯ ПЕДАГОГІ!

Вашай увазе прадстаўляюцца метадычныя матэрыялы да фільма пра былога вязня Мінскага гета Алену Драпкіну. Дадзены відэаролік быў створаны ў 2020 г. Яўрэйскім гістарычным інстытутам “Centropa” пры экспертнай падтрымцы Гістарычнай майстэрні імя Л. Левіна.

Лічбы загінулых у Беларусі, прыведзеныя ў падручніках і даследаваннях пра вайну, наводзяць жах. Але, каб лепш зразумець маштаб катастрофы, усвядоміць страты грамадства, трэба вывучаць, уяўляць канкрэтныя лёсы ахвяр. А мы ведаем пра іх усё яшчэ мала, як, напрыклад, пра тых, хто быў у Мінскім гета.

Мінскае гета было самым вялікім у Беларусі. За час яго існавання ў ім знаходзілася па розных ацэнках да 100 тысяч яўрэяў, сярод якіх былі не толькі мясцовыя жыхары, але і дэпартаваныя з Еўропы, з розных гарадоў Аўстрыі, Германіі, Чэхіі, якія па нараджэнні прадстаўлялі яшчэ большую колькасць краін. Большасць з іх загінулі. Таму гісторыя Халакосту на беларускай зямлі мае агульнаеўрапейскае вымярэнне. Мы памятаем пра гэтую трагедыю і пра тое, што яўрэі супраціўляліся. Гісторыя Алены, якая страціла ўсіх блізкіх у гета, а затым уступіла ў партызанскія шэрагі, змагалася з акупантамі на працягу некалькіх гадоў і была параненая, таксама пра гэта. Яе лёс аб’ядноўвае Беларусь і Расію, куды дзяўчына перабралася пасля вайны, каб пераадолець цяжкую траўму страты членаў сям’і падчас Халакосту. Яна прайшла доўгі шлях і да асэнсавання сваёй яўрэйскай ідэнтычнасці.

Гэты фільм застаецца памяццю пра гэтага выдатнага чалавека, яе гісторыю выратавання, а таксама нагадвае нам пра гісторыю яўрэйскай абшчыны Беларусі, якая была адной з самых вялікіх у Еўропе і, на няшчасце, была асуджаная на пагібель падчас Халакосту.

Праз “ажыўленне” фатаграфій, агучванне ў стылі вуснай гісторыі адбываецца знаёмства з гераіняй. Гэты відэаролік можна проста праглядзець падчас занятку і абмеркаваць узніклыя ў навучэнцаў пытанні. Пасля сыходу сведак такія фільмы з’яўляюцца добрай дапамогай для сенсібілізацыі моладзі памятаць пра трагедыю вайны. Прапаноўваючы ім розныя тэмы для абмеркавання, магчыма развіваць крытычнае мысленне, актуалізаваць гістарычныя веды, іх цікавасць да тэмы.

У дадзеных матэрыялах наша каманда дыдактыкаў прапануе вам паспрабаваць і іншыя варыянты працы з фільмам. Мы запрашаем вас папрацаваць з дзецьмі з дадатковымі тэмамі: сям’я, трансфармацыя асобы пад уплывамі гістарычных падзей, аналіз біяграфіі, пераадоленне траўмы, лёс жанчыны падчас Другой сусветнай вайны. Для гэтага рэкамендуецца выкарыстоўваць розныя метады і крыніцы інфармацыі.

У брашуры для вас сабраныя: біяграфія сведкі часу, спіс асоб, згаданых у фільме, яго структура, кароткі гістарычны кантэкст, храналогія гістарычных падзей і жыцця гераіні фільма, рэкамендацыі па выкарыстанні матэрыялаў і пяць метадычных распрацовак.

Таксама размешчаны QR-коды на сайт з метадычнымі распрацоўкамі ўдзельнікаў конкурсу ўрокаў да фільма пра Алену Драпкіну, які быў прысвечаны памяці ахвяр пагрому на “Яме” 2—3 сакавіка 1942 г., і дыдактычны дапаможнік “Мінскае гета”. Распрацоўкі разлічаны ў першую чаргу на навучэнцаў 9—11 класаў, могуць выкарыстоўвацца на розных тыпах заняткаў.

Педагагічны ўплыў ад працы па дадзеных матэрыялах можа быць узмоцнены, калі ў вас атрымаецца выкарыстоўваць іх у спалучэнні з наведваннем і абмеркаваннем гісторыі лакальных месцаў, звязаных з Халакостам. Распрацоўкі могуць выкарыстоўвацца модульна, як будзе зручна педагогу і ў залежнасці ад наяўных магчымасцей.

Дапаможныя матэрыялы, у тым ліку фільм і ўрокі, дасланыя на конкурс, размешчаны на сайце https://pamjat.centropa.org/by/. Іх можна дэманстраваць праз праектар ці раздрукоўваць і размяшчаць на сталах навучэнцаў для лепшага ўспрымання.

Жадаем вам цікавых адукацыйных эксперыментаў!

**Ірына Кашталян,**
Дырэктар Гістарычнай майстэрні імя Л. Левіна (2018-2021)



АЛЕНА ДРАПКІНА (МІНСК 1945)

# ЧАСТКА I.
# МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПРАЦЫ З ФІЛЬМАМ ПРА АЛЕНУ ДРАПКІНУ

## БІЯГРАФІЯ СВЕДКІ ВАЕННЫХ ПАДЗЕЙ

Алена Драпкіна нарадзілася ў Мінску ў 1924 г. у сям'і Ошэра і Гінды Левіных. Маці працавала ў гарвыканкаме, бацька — бухгалтарам. У Алены былі два браты — старэйшы Гірш і малодшы Саул.

Дзядуля Алены, Эль Хаютоўскі, быў рэлігійным чалавекам. Ён і яго дачка Соня трымаліся кашруту нават падчас вайны. Менавіта дзядуля пазнаёміў Алену і яе братоў з яўрэйскімі рэлігійнымі традыцыямі.

Алена вучылася ў школах №34 і №21 г. Мінска, у 1941 г. скончыла 9 клас. Займалася плаваннем у гарадскім спартыўным таварыстве, устанавіла некалькі рэкордаў БССР, удзельнічала ва ўсесаюзных спаборніцтвах у 1939 г. Алена наведвала драматычны гурток у Палацы піянераў. Там яна пазнаёмілася і пасябравала з Машай Брускінай, будучай удзельніцай мінскага падполля.

Пасля нападу нацысцкай Германіі на СССР сям'і Левіных не ўдалося эвакуявацца з Мінска. Старэйшы брат, Гірш, пайшоў на фронт, дзе знік без вестак.

Пасля стварэння ў горадзе гета сям'я Левіных была вымушаная перасяліцца туды. Неўзабаве загінуў бацька Алены. Падчас пагромаў 1941 г. былі забітыя ўсе яе блізкія сваякі — дзядуля, цёця Соня, мама і малодшы брат.

Застаўшыся адна, Алена, каб выжыць, уладкавалася працаваць на склад чыгункі. Яна стала планаваць уцёкі з гета. Летам 1942 г. электрыкі склада, вядомыя Алене як Чэхаўскі і Віктар, зрабілі ёй падроблены пашпарт на імя полькі Ядвігі Скроцкай. Працаўніца склада Лена дапамагла дзяўчыне сысці з горада. А сястра Лены, якая жыла ў 50 км ад Мінска, паказала ўцякачцы шлях у Заходнюю Беларусь, дзе Алена спадзявалася знайсці працу ў сялян. Так, дзякуючы дапамозе неабыякавых людзей, Алене Драпкінай удалося збегчы з Мінскага гета.

Яна хавалася на хутары сялянскай сям'і. Увосень 1942 г. Алена сышла ў партызанскі атрад брыгады «Бальшавік» і ўдзельнічала ва ўзброенай барацьбе з нацыстамі да ліпеня 1944 г. Яна прымала ўдзел у баявых аперацыях. Пасля ранення стала камендантам адной з вёсак партызанскай зоны.

Пасля вызвалення БССР Алена працавала ў гарвыканкаме Мінска. У 1945 г. яна пераехала ў Ленінград (цяпер Санкт-Пецярбург, Расія) і паступіла ў зубалячэбную школу, якую скончыла ў 1948 г. Алена працавала дзіцячым стаматолагам да выхаду на пенсію ў 1985 г.

У 1946 г. Алена выйшла замуж за Вульфа Драпкіна. Вяселле прайшло па яўрэйскай традыцыі (хупа) у сінагозе. У 1947 г. Алена нарадзіла сына, а ў 1949 г. заўдавела. У 1960 г. яна зноў выйшла замуж за Лейба Свердліна, з якім пражыла 28 гадоў, выхоўваючы сына і дзяцей мужа ад першага шлюбу.

Апошнія гады жыцця актыўна ўдзельнічала ў дзейнасці клуба яўрэяў-франтавікоў. Кожную суботу наведвала гарадскую сінагогу, знаходзячы там душэўнае суцяшэнне.

# АСОБЫ, ЯКІЯ ЗГАДВАЮЦЦА Ў ФІЛЬМЕ

## БРУСКІНА МАША
1924 — 26.10.1941

удзельніца мінскага падполля, пакараная смерцю нацыстамі ў Мінску.

## БУЛАХ ПАВЕЛ

селянін, на хутары якога працавала Алена Драпкіна пасля ўцёкаў з гета.

## ДРАПКІН АЛЯКСАНДР
нар. 9.05.1947

сын Алены і Вульфа Драпкіных.

## ДРАПКІН БАРЫС

брат Драпкіна Вульфа, загінуў у гады Другой сусветнай вайны.

## ДРАПКІН ВУЛЬФ
1921–1949

першы муж Алены Драпкінай.

## ЛЕВІН АНАТОЛЬ
? — 1941

брат бацькі Алены Драпкінай, загінуў у Мінскім гета.

## ЛЕВІН ГІРШ
1920 — ?

старэйшы брат Алены Драпкінай, знік без вестак.

## ЛЕВІН ОШЭР
1891–1941

бацька Алены Драпкінай, загінуў у Мінскім гета.

## ЛЕВІН САУЛ
1929–1941

брат Алены Драпкінай, загінуў у Мінскім гета.

## ЛЕВІНА (ХАЮТОЎСКАЯ) ГІНДА
1895–1941

маці Алены Драпкінай, загінула ў Мінскім гета.

## МАРОЗАЎ ЛЕАНІД

камандзір партызанскай брыгады «Бальшавік».

## СВЕРДЛІН ЛЕЙБ
? — 1988

другі муж Алены Драпкінай.

## ХАЮТОЎСКІ ЭЛЬ
1870–1941

дзядуля Алены Драпкінай, загінуў у Мінскім гета.

## ШЭЛУПСКАЯ (ХАЮТОЎСКАЯ) СОНЯ
? — 1941

сястра маці Алены Драпкінай, загінула ў Мінскім гета.

# СТРУКТУРА ФІЛЬМА

ПРАЦЯГЛАСЦЬ
00:13:50

| Таймінг | Назва ўрыўка | Змест | Каментары |
|---|---|---|---|
| 0:00 – 0:52<br>52 сек | | Уступ | Даваенны Мінск і яго жыхары, месца горада на карце БССР. |
| 0:53 – 2:51<br>1 хв 58 сек | Ч. 1. МІРНАЕ ЖЫЦЦЁ | Даваенная гісторыя сям’і Алены Драпкінай | Пра сям’ю, іх самаідэнтычнасць, пра дзяцінства самой Алены 1924 г.н., яе інтарэсы (тэатр, плаванне), сяброўства з Машай Брускінай. |
| 2:52 – 6:16<br>3 хв 24 сек | Ч. 2. ЖЫЦЦЁ Ў ПЕКЛЕ | Гісторыя Алены з пачатку вайны да ўцёкаў з гета | Пачатак вайны, сыход брата Алены на фронт, бамбёжкі Мінска і яго захоп немцамі.<br><br>Арганізацыя Мінскага гета. Апісанне яго штодзённасці (аблавы, прымусовая праца, прыбыццё дэпартаваных заходнееўрапейскіх яўрэяў і інш.). Смерць блізкіх (у тым ліку дэталёвае апісанне пагрому 20 лістапада 1941 г., павешанне сяброўкі Машы Брускінай).<br><br>Алена засталася адна і вырашыла збегчы з гета. |
| 6:17 – 8:41<br>2 хв 24 сек | Ч. 3. ЖЫЦЦЁ ВА ЎЦЁКАХ | Выратаванне Алены: ад уцёкаў да актыўнага ўдзелу ў партызанскай барацьбе | Выраб падробленых дакументаў, дапамога неяўрэяў, утойванне ідэнтычнасці, уцёкі з горада ў вёску. Сустрэча з партызанамі, рашэнне далучыцца да атрада “Спартак” лагойскай брыгады “Бальшавік”. Удзел у баях, раненне, дапамога ў ахове вёскі. |
| 8:42 – 13:06<br>4 хв 24 сек | Ч. 4. НОВЫ ПАЧАТАК | Паваеннае жыццё Алены: ад’езд з Беларусі, стварэнне сям’і ў Ленінградзе | Разбураны Мінск і цяжкае ў ім знаходжанне Алены з-за траўмы страты блізкіх.<br><br>Рашэнне аб пераездзе ў Ленінград, дзе яна сустракае першага мужа. Яго маці нягледзячы на пагрозу для кар’еры сына настойвае на традыцыйным яўрэйскім абрадзе жаніцьбы, а затым і бар-міцве ўнука.<br><br>Нараджэнне сына Алены і пасля хуткая смерць мужа. Канцэнтрацыя на працы. Стварэнне другой сям’і. Праз дваццаць восем гадоў яна зноў адна, пагружаная ў працу. На пенсіі актыўна ўдзельнічала ў клубе для яўрэяў-франтавікоў, звярнулася да іўдаізму. Гэта ёй дапамагала асэнсаваць мінулае жыццё і страту блізкіх. |

# КАРОТКІ ГІСТАРЫЧНЫ КАНТЭКСТ

**ЧАСТКА I.**
## ЖЫЦЦЁ ЯЎРЭЯЎ ДА ВАЙНЫ

Яўрэі жывуць на беларускіх землях з часоў князя Вітаўта. Жылі яны ў гарадах і мястэчках. У Мінску знаходзілася вялікая яўрэйская абшчына, асаблівасцю пражывання якой было рассяленне па ўсім горадзе, а не ў асобных кварталах. Шпацыруючы па Ракаўскім прадмесці сталіцы, можна пабачыць шмат слядоў дзейнасці абшчыны: напрыклад, былую ешыву (вышэйшую духоўную ўстанову) і пачатковую школу — Талмуд-Тору.

Яшчэ сто год таму шыльды на чатырох мовах (беларускай, ідышы, польскай ды рускай) не былі рэдкасцю і знаходзіліся на розных будынках Мінску. У перыяд 1920–1930-х гг. у БССР ідыш — традыцыйная мова яўрэяў гэтай часткі Еўропы — нават была адной з дзяржаўных моў.

На чэрвень 1941 г. у БССР пражывала 1 075 000 яўрэяў. У гэты лік уваходзілі таксама ўцекачы з заходняй часткі Польшчы, якія выратоўваліся на тэрыторыі БССР пасля ўварвання войск нацысцкай Германіі ў 1939 г. [1].

**ЧАСТКА II.**
## МІНСКАЕ ГЕТА

Колькасць яўрэяў у Мінску на пачатак вайны складала трэцюю частку ад даваеннай колькасці жыхароў. У сувязі з пагрозай сталіцу пакінула 98 тыс. чалавек, у тым ліку і прыкладна 45 тыс. яўрэяў [1]. У “Чорнай кнізе” В. Гросмана і І. Эрэнбурга сцвярджаецца, што каля 75 тыс. грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці (разам з дзецьмі), не паспеўшы з’ехаць, засталіся ў горадзе [2, с. 106].

На жаль, з пачаткам аперацыі “Барбароса” на акупаванай тэрыторыі Беларусі пачаліся акцыі па знішчэнні яўрэйскага насельніцтва: пагромы ды расстрэлы. Колькасць яўрэйскіх абшчын пачала скарачацца. У некаторых яўрэяў атрымалася эвакуіравацца на ўсход СССР. Тыя, хто не паспелі і вымушаны былі застацца, патрапілі ў гета, якія былі створаны ў шматлікіх населеных пунктах. Найбуйнейшым з іх было Мінскае гета.

19 ліпеня 1941 г. было прынятае рашэнне аб яго стварэнні. Па колькасці зняволеных на акупаванай тэрыторыі СССР яно займала другое месца пасля Львоўскага. Яго тэрыторыя складалася прыкладна з 40 вуліц ды завулкаў паўночна-заходняй часткі горада [3, л. 1-2].

**ГЕТА**

**(італ. ghetto nuovo — «новая ліцейная») — частка горада, адведзеная для прымусовага пасялення дыскрымінаваных груп людзей. Падчас Другой сусветнай вайны — спецыяльныя кварталы для пражывання яўрэйскага насельніцтва.**




Схематычная карта вуліц Мінскага гета, адноўленая аўтарам кнігі “Праўда аб Мінскім гета” Абрамам Рубенчыкам [III].

Распаўсюджанай праблемай у Мінскім гета была цесната. На аднаго дарослага прыходзілася прыблізна 1,5 м² жылой плошчы. У адным пакоі пражывалі па некалькі сем'яў. Харчаванне было нерэгулярным. Асноўным прадуктам харчавання былі бульбяныя ачысткі, лупіны ды іншыя адкіды, якія знаходзілі ў горадзе падчас шляху на працу і назад у гета.

У гета не было крам, лазні. Ваду для піцця бралі з вулічных калонак ды калодзежаў. Электрычнасць адсутнічала.

Сведкі часу ўзгадваюць, што вязні Мінскага гета павіны былі насіць спецыяльныя апазнавальныя знакі: лату жоўтага колеру.


Яўрэі прыбіраюць снег на чыгуначным вакзале, Мінск, люты 1942 г. [I]

Спачатку на тэрыторыі Мінскага гета адбываліся расстрэлы, якія не мелі масавага ды сістэматычнага характару. Людзей забівалі за адмову выходзіць на працу, за нежаданне выконваць нямецкія загады і г.д. Але ўжо са жніўня 1941 г. нацысты пачалі актыўна займацца ў гета "вырашэннем яўрэйскага пытання".

Немцы рабілі значны акцэнт на паступовае, мэтанакіраванае і сістэматычнае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва, у тым ліку старых, жанчын і дзяцей. Ліквідацыя вязняў гета адбывалася шляхам правядзення пастаянных аблаў, начных налётаў у кватэры жыхароў гета, масавых пагромаў, лоўлі людзей на вуліцах і вывазу іх у невядомым кірунку, адкуль яны больш не вярталіся.

У гісторыі Мінскага гета можна вылучыць каля 10 асноўных дзённых і начных пагромаў. Але гэта мінімальная лічба. Першы вялікі пагром адбыўся 7 лістапада 1941 г., а скончыў гісторыю гета пагром 21–23 кастрычніка 1943 г.

Унутры Мінскага гета знаходзілася і гета для дэпартаваных яўрэяў з Германіі, Аўстрыі і Чэхіі — Зондэргета. Першы эшалон з дэпартаванымі прыехаў у лістападзе 1941 г. Усяго было 27 эшалонаў, з якіх 7 прыбылі ў Мінск (яго пасажыры сталі вязнямі гета), а астатнія былі накіраваныя ў Благаўшчыну, дзе прыбылых забівалі адразу па прыездзе.



Лазар Ран, "Пекла"[II]

Некаторыя вязні гета змаглі ўратавацца. У шматлікіх дамах былі зробленыя **маліны** — сховішчы, у якіх падчас небяспекі хаваліся цэлымі сем'ямі. У гета існаваў Супраціў, дзейнічала падполле. Так, у інфекцыйным шпіталі знаходзіўся адзін з цэнтраў, дзе лячылі параненых, збіралі медыкаменты, зброю, быў арганізаваны пункт перапраўкі ўцекачоў у партызанскія атрады.

На пытанне аб колькасці знішчаных яўрэяў у Мінскім гета з лета 1941 па восень 1943 г. нельга даць дакладны адказ. Але магчыма назваць прыблізную лічбу, абапіраючыся на архіўныя матэрыялы, дакументы і падлікі даследчыкаў. Яшчэ ў пачатку лютага 1943 г. начальнік выведвальнага аддзела Беларускага штаба партызанскага руху палкоўнік М.А. Скрыннік адзначаў у сваіх справаздачах аб злачынствах нямецкіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі:

*"...у Мінску ў гета было сабрана 100 тыс. чалавек... Усяго (на люты 1943 г.)... знішчана звыш 92 тыс. чалавек яўрэйскага насельніцтва" [4, л. 29–31].*

Гэтая колькасць ахвяр лічыцца найбольш адпаведнай, аднак не канчатковай.

Пасля вайны ў тых, хто выжыў, з'явілася надзея на новае жыццё, але заставаліся складанасці. Людзі вучыліся жыць наноў і прымаць страту блізкіх, і ў той жа час сутыкнуліся з савецкім антысемітызмам. Па стварэнні дзяржавы Ізраіль у 1948 г. пераехаць туды савецкім яўрэям было складана, многія змаглі гэта здзейсніць толькі пасля распаду СССР. Тыя, хто прайшлі пекла гета і канцэнтрацыйных лагераў, хавалі сваё мінулае, бо баяліся пераследу ў савецкі час. Свае гісторыі яны змаглі распавесці толькі пасля 1991 г.

Гл. падрабязней:
Дыдактычны дапаможнік
"Мінскае гета"

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларусь. Историческая справка [Электронный ресурс] — Яд Вашем, Мемориальный комплекс изучения Холокоста. Режим доступа: https://www.yadvashem.org/ru/righteous/stories/belarus.html. Дата доступа: 24.01.2022.

2. Гроссман, В. Чёрная книга: о злодейском повсеместном убийстве евреев немецко-фашистскими захватчиками во временно оккупированных районах Сов. Союза и в лагерях Польши во время войны 1941–1945 / В. Гроссман, И. Эренбург. — Вильнюс: Йад, 1993. — 578 с.

3. Загад камянданта 812 палявой камендатуры ад 19 ліпеня 1941 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Фонд 359. — Воп. 1. — Спр. 8.

4. Из справки начальника разведотдела БШПД полковника Скрынника Н.А. о преступлениях гитлеровцев на территории Беларуси // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). — Фонд 1450. — Оп. 3. — Д. 39.

5. Рапорт о положении евреев в Минском гетто с 1.9 по 25.10 1943 г. (от командира партизанского отряда Зорина уп. ЦК КП(б)Б по Ивенецкому межрайцентру т. Дубову) // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). — Фонд 1450. — Оп. 4. — Д. 277.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ІЛЮСТРАЦЫЙ

I. Яўрэі прыбіраюць снег на чыгуначным вакзале, Мінск, люты 1942 г. [Фатаграфія] // Федэральны архіў, выява 183-B07892.

II. Ран Л. Пекла. З серыі “Мінскае гета”. Афорт. 1962-1972 гг. [Фотакопія] [Электронны рэсурс] / Беларусь культурная. Крупный план: Личность и время // Независимый израильский сайт. — 2020. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?tag=lazar-ran. Дата доступа: 24.01.2022.

III. Схематычная карта вуліц Мінскага гета, адноўленая аўтарам кнігі “Правда о Минском гетто” Абрамам Рубенчыкам [Схема] / Документальная повесть малолетнего узника Минского гетто, юного партизана Абрама Рубенчика. — Дфус офсет Исраэли Лийтцу ЛТД. Израиль, 2006. — С. 252.

# ХРАНАЛОГІЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ І ЖЫЦЦЯ ГЕРАІНІ ФІЛЬМА

| | | | |
|---|---|---|---|
| Стварэнне СССР | **1922** | | |
| Пачатак ідышызацыі ў межах культурнай палітыкі ў БССР | **1924** | | У сям'і мінскіх яўрэяў Левіных нараджаецца дачка Алена |
| | **1932** | | Алена паступіла ў 1-ы клас СШ №34 г. Мінска |
| Прыход Адольфа Гітлера да ўлады ў Германіі | **1933** | | |
| Уварванне Германіі ў Польшчу. Пачатак Другой сусветнай вайны | **1939** | **1 верасня** | |
| Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Украіну | | **17 верасня** | |
| Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР | | **Кастрычнік – лістапад** | Удзел ва Усесаюзных спаборніцтвах па плаванні |
| | **1941** | **Май** | Заканчэнне навучання ў 9-гадовай сярэдняй школе |
| Напад Германіі на СССР. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны | | **22 чэрвеня** | Сыход старэйшага брата Гірша на фронт |
| Акупацыя нямецкімі войскамі Мінска | | **28 чэрвеня** | Уцёкі Левіных у Астрашыцкі Гарадок, а затым вяртанне ў Мінск |
| Загад аб стварэнні Мінскага гета | | **19 ліпеня** | Перасяленне сям'і Левіных у гета |
| Пачатак пагромаў у Мінскім гета | | **Жнівень** | Гібель бацькі Ошэра Левіна |
| Нацысцкая акупацыя ўсёй тэрыторыі Беларусі | | **Верасень** | |
| Першыя масавыя акцыі знішчэння вязняў Мінскага гета | | **Лістапад** | Гібель Гінды і Саула Левіных — маці і малодшага брата Алены |
| Ванзейская канферэнцыя. «Канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання» | **1942** | **20 студзеня** | |
| Вялікі пагром у Мінскім гета на яўрэйскае свята Пурым | | **2–3 сакавіка** | |
| | | **Зіма – вясна** | Праца ў працоўных калонах вязняў гета |
| | | **Красавік** | Атрыманне падробленага пашпарта на імя Ядвігі Скротскай |
| Пачатак масавых расстрэлаў ва ўрочышчы Благаўшчына | | **Май** | |
| Чатырохдзённы пагром у Мінскім гета | | **28–31 ліпеня** | Уцёкі Алены з гета |
| Пераход Чырвонай Арміі ў контрнаступленне | | **Восень** | Уступленне ў партызанскі атрад «Бальшавік» |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Забойства мінскімі падпольшчыцамі гаўляйтара Беларусі Вільгельма Кубэ | **1943** | **22 верасня** | |
| Ліквідацыя Мінскага гета | | **21–23 кастрычніка** | |
| | | **Восень** | Раненне Алены ў баі |
| Пачатак вызвалення Беларусі Чырвонай Арміяй | **1944** | **Канец 1943 – пачатак 1944** | Праца камендантам вёскі Марозаўка ў партызанскай зоне |
| Аперацыя «Баграціён» | | **Лета** | Злучэнне партызанскага атрада «Бальшавік» з часткамі Чырвонай Арміі |
| Вызваленне Мінска | | **3 ліпеня** | |
| | | **Ліпень** | Вяртанне ў Мінск |
| Капітуляцыя Германіі. Завяршэнне вайны ў Еўропе | **1945** | **9 мая** | Праца ў Мінскім гарвыканкаме |
| | | **Жнівень** | Пераезд у Ленінград |
| Капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны | | **Верасень** | Паступленне ў зубалячэбную школу |
| Пачатак Нюрнбергскага трыбунала | | **Лістапад** | |
| | **1946** | **9 жніўня** | Вяселле Алены і Вульфа Драпкіных паводле яўрэйскай традыцыі |
| Пачатак барацьбы з касмапалітызмам у СССР | **1947** | | |
| | | **9 мая** | Нараджэнне сына |
| | **1948** | | Працаўладкаванне ў дзіцячую стаматалагічную клініку |
| | **1949** | | Смерць мужа |
| Справа «яўрэйскіх урачоў» | **1953** | | |
| | **1960** | | Жаніцьба з другім мужам Лейбам Свердліным |
| | **1985** | | Выхад на пенсію |
| Распад СССР | **1991** | | |
| | **1990-я** | | Актыўная дзейнасць у клубе яўрэяў-франтавікоў |
| Устаноўка скульптурнай кампазіцыі “Апошні шлях” на мемарыяле “Яма” | **2000** | | |

ЧАСТКА II.
# ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЗАНЯТКАЎ

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ

| **Назва** | **Працягласць** | **Ідэя** | **Мэтавая група навучэнцаў** | **Тэма** |
|---|---|---|---|---|
| СЯМ'Я | 60 хв | Яўрэйская самаідэнтыфікацыя, пра ролі маці, бацькі, братоў, мужоў, пра ўплыў традыцый, пасляваеннага антысемітызму | Ад 15 гадоў | *Грамадазнаўства* — накіраванасць асобы; сямейныя адносіны; культурная разнастайнасць і дыялог культур; полікультурнае ўзаемадзеянне |
| ЯЎРЭІ МІНСКА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ.: ТРАДЫЦЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ І САВЕТЫЗАЦЫЯ | 45 хв | Пераўтварэнне традыцыйнай яўрэйскай культуры ў савецкую, сляды яўрэяў у Мінску, яўрэйскія традыцыі | Ад 14 гадоў | *Сусветная гісторыя, гісторыя Беларусі* — культурныя пераўтварэнні ў СССР; грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 40-х — першай палове 60-х гг. XX ст. *Грамадазнаўства* — нацыянальныя культуры; полікультурнае ўзаемадзеянне |
| БІЯГРАФІЯ АСОБЫ ЯК ЧАСТКА ГІСТОРЫІ | 45 хв | Адна з многіх — лёс чалавека ў гісторыі краіны | Ад 14 гадоў | *Сусветная гісторыя, гісторыя Беларусі* — барацьба з захопнікамі на акупаванай тэрыторыі; германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.; разгортванне народнай барацьбы супраць германскіх акупантаў. *Грамадазнаўства* — сацыяльныя ролі |
| ПЕРАЖЫЦЬ НЕМАГЧЫМАЕ | 45 хв | Стратэгіі паводзін чалавека | Ад 14 гадоў | *Сусветная гісторыя, гісторыя Беларусі* — барацьба з захопнікамі на акупаванай тэрыторыі; германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.; разгортванне народнай барацьбы супраць германскіх акупантаў. *Грамадазнаўства* — скіраванасць асобы; сацыяльныя нормы і паводзіны асобы |
| ПЕРАМАГЛА ВАЙНУ | 90 хв | Лёс жанчыны падчас вайны. Як чалавека змяняе вайна | Ад 16 гадоў | *Сусветная гісторыя, гісторыя Беларусі* — нацысцкі акупацыйны рэжым у гады Другой сусветнай вайны; Супраціў нацысцкаму рэжыму; штодзённасць у гады Другой сусветнай вайны. *Грамадазнаўства* — сацыяльныя статусы, ролі і мабільнасць |



АЛЕНА ДРАПКІНА З МУЖАМ ВУЛЬФАМ І СЫНАМ АЛЯКСАНДРАМ (ЛЕНІНГРАД, СССР, 1949)

## **ТЭМА ЗАНЯТКУ:** СЯМ’Я

МЭТАВАЯ ГРУПА навучэнцы ад 15 гадоў.

ПРАЦЯГЛАСЦЬ 60 хв (прагляд фільма 14 хв, частка I — 25 хв, частка II — 15 хв).

МЭТА фарміраванне ў вучняў разумення сямейных каштоўнасцей на прыкладзе гісторыі Алены Драпкінай.

ЗАДАЧЫ
- стварыць умовы для выхавання паважлівага стаўлення да паняцця «сям’я», талерантнасці і да гісторыі, культуры іншых народаў;
- садзейнічаць развіццю навыкаў абагульнення і сістэматызацыі вучэбнага (гістарычнага) матэрыялу, вылучэння меркаванняў і ацэначнай характарыстыкі падзей і фактаў на аснове эмпатычнага ўспрымання фрагментаў з жыцця людзей падчас нямецкай акупацыі.

ФОРМЫ ПРАЦЫ франтальная, групавая, індывідуальная.

МЕТАДЫ мазгавы штурм, рашэнне праблемных сітуацый, дыскусія, прэзентацыя.

МАТЭРЫЯЛЫ раздатачны матэрыял: карткі з урыўкамі ўспамінаў Драпкінай, карткі і стыкеры для мазгавога штурму, фільм пра Алену Драпкіну.

На занятках прапануецца абмеркаваць пытанні, якія ўзнікаюць пасля прагляду відэа і вывучэння біяграфіі Алены Драпкінай, — фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці, адносіны ў яўрэйскай сям’і, роля маці, бацькі, братоў, мужоў, уплыў традыцый, у тым ліку пасляваеннага антысемітызму.

Пасля прагляду фільма ў двух модулях прапануецца выканаць заданні, выкарыстоўваючы дапаможныя матэрыялы (урыўкі з успаміну сведкі, яе біяграфію і лінію часу ў брашуры).

**ЧАСТКА І.**
## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ
(25 ХВ)

ПЛАНУЕМЫ ВЫНІК:

навучэнцы прыйдуць да высновы аб тым, што яўрэі спрабавалі захаваць сваю нацыянальную спецыфіку ва ўмовах савецкай рэчаіснасці (у даваенныя і пасляваенныя гады).

### ЗАДАННЕ 1.
Мазгавы штурм па пытанні «Што такое нацыянальнасць?»

Настаўнік арганізуе апытанне ў класе:
- Што, на вашу думку, павінна быць галоўным пры вызначэнні нацыянальнасці чалавека?

На дошцы знаходзяцца карткі
- нацыянальнасць бацькі, нацыянальнасць маці, мова зносін у сям'і, тэрыторыя нараджэння, асабістае жаданне, запіс у пашпарце і іншае.

Вынікі апытання афармляюцца на дошцы з дапамогай стыкераў.

Настаўнік тлумачыць, што нацыянальнасць для сучаснага чалавека ўсё яшчэ застаецца адным з ключавых паняццяў для ідэнтыфікацыі сябе як асобы. І просіць навучэнцаў паразважаць:

- Ці з'яўляецца гэтая прыкмета нечым прыроджаным і безумоўным ці ж гэта сацыяльны канструкт або культуралагічнае паняцце? І чым нацыянальнасць адрозніваецца ад нацыі ці этнасу?
- Чаму людзям важная іх нацыянальная ідэнтычнасць?
- Чаму ў яўрэяў нацыянальнасць вызначаецца па маці? Словы «яўрэй» (асоба яўрэйскай нацыянальнасці) і «іўдзей» (г.зн. хто спавядае іўдаізм) — гэта адно і тое ж?

*Парады настаўніку:* настаўніку неабходна нагадаць правілы вядзення дыскусіі (гл. **ДАДАТАК 2**).

### ЗАДАННЕ 2.
Настаўнік тлумачыць, што ў канцы 1920-х і ў 1930-х гг. у СССР існавала двaістая палітыка ў адносінах да нацыянальных груп насельніцтва. Гэта тычылася і яўрэяў. З аднаго боку, была прапаганда касмапалітызму, роўнасці. Але, з іншага боку, гэта ўсё суправаджалася барацьбой з іх ідэнтычнасцю як яўрэяў — усе мусілі быць савецкімі грамадзянамі. Традыцыйная яўрэйская культура Беларусі разбуралася. Пасля вайны многія яўрэі пад ціскам антысеміцкай палітыкі ўладаў хавалі сваю нацыянальную ідэнтычнасць.

Настаўнік дзеліць клас на групы, і далейшае выкананне заданняў у дадзенай частцы занятку праходзіць у форме групавой дыскусіі. Ад кожнай з груп выбіраецца адзін навучэнец, які потым прадставіць вынікі.

Навучэнцы ў групах знаёмяцца з біяграфіяй, храналогіяй жыцця, урыўкамі ўспаміну Алены Драпкінай (гл. **ДАДАТАК 1**). На прыкладзе яе лёсу клас паспрабуе паказаць, як яна вызначала сваю нацыянальную ідэнтычнасць у даваенны перыяд і пасля вайны.

- На якой мове гаварылі ў сям'і Алены? Як вы лічыце, чаму менавіта на гэтай мове?
- Якую адукацыю атрымала Алена?
- Якія адносіны існавалі паміж яўрэямі і іншымі этнічнымі групамі ў Мінску ў даваенныя і пасляваенныя гады?
- Як паўплывала перажытае падчас вайны на светапогляд Алены? Ці змянілася яе самаідэнтычнасьць? Калі так, то ў чым гэта выяўляецца?

### ЗАДАННЕ 3.
АНАЛІЗ ФРАГМЕНТАЎ ФІЛЬМА

1. 0:53 – 2:51 (1 хв 58 сек)
2. 8:42 – 13:06 (4 хв 24 сек)

Кожная група працуе са сваім урыўкам (прадстаўнік кожнай групы выцягвае нумар урыўка).

Картка заданняў для кожнай групы:

- Якая галоўная тэма фрагмента? Прыдумайце для фрагмента назву.
- Дзе адбываецца дзеянне ўрыўка?
- Апішыце асобных персанажаў, прадстаўленых у фрагменце.
- Пакажыце дадзены фрагмент у выглядзе постара.

ПАРАДЫ НАСТАЎНІКАМ
**ЯК ПРАЦАВАЦЬ З ФІЛЬМАМ**

1. **Пры праглядзе фільма ці фрагмента варта звярнуць увагу на сюжэт, на персанажаў — гаворка, вопратка, прадметы побыту. Даць ацэнку персанажам: якія з іх з'яўляюцца станоўчымі, а якія — адмоўнымі?**
2. **Вызначыць, да якога жанру належыць фільм.**
3. **Вызначыць, да якога часу адносяцца падзеі фільма (пазначыць элементы фільма, якія дапамаглі гэта вызначыць). Наколькі праўдзіва прадстаўлены падзеі ў фільме.**
4. **Якія кінематаграфічныя прыёмы былі выкарыстаны (праца аператара, мантаж, музычнае суправаджэнне)?**

**ЧАСТКА II.**
КАШТОЎНАСЦІ СЯМ’І
(15 ХВ)

## ЗАДАННЕ 1.
ПРАЦА З ВОБЛАКАМ СЛОЎ

ПЛАНУЕМЫ ВЫНІК:

навучэнцы зразумеюць, што ў працэсе фарміравання асобы сям’я грае галоўную ролю. Менавіта ў сям’і чалавек пачынае рабіць свае першыя крокі насустрач пазнанню свету. Усё, што чалавек атрымлівае ў сям’і, ён захоўвае на працягу ўсяго наступнага жыцця. Важнасць сям’і ў тым, што ў ёй чалавек праводзіць большую частку свайго жыцця. Менавіта ў сям’і закладваюцца асновы асобы. Яна пачынае фармавацца ў дзіцяці з першых дзён жыцця ў працэсе блізкіх стасункаў з маці, бацькам, братамі, сёстрамі, дзядулямі, бабулямі і іншымі сваякамі. Сям’я спрыяе з’яўленню ў асобы вобразу свайго «Я».

Выкананне заданняў у дадзенай частцы занятку праводзіцца ў форме групавой дыскусіі.

Картка заданняў для кожнай групы:

1. Выбраць тры найбольш важныя жыццёвыя каштоўнасці з воблака слоў.
2. Якія жыццёвыя каштоўнасці абрала б Алена? Як вы думаеце, ці змяняліся яны на працягу жыцця? Пацвердзіце свае адказы цытатамі з біяграфіі.
3. Параўнайце: у чым выяўляецца адрозненне і што з’яўляецца агульным у выбраных вамі каштоўнасцях і Алены? Чаму?
4. Стварыце падборку фотаздымкаў, якія ілюструюць жыццёвыя каштоўнасці Алены.

Пасля выканання задання групы прадстаўляюць адказы.

Настаўнік прапануе абмеркаваць класу наступныя пытанні:

- Што ўключаюць у сябе сямейныя каштоўнасці?
- Якую ролю сям’я адыгрывае ў жыцці кожнага чалавека? Што такое сям’я для вас?
- Што вы ведаеце пра традыцыі яўрэйскай сям’і?
- Як вы думаеце, што такое сям’я для Алены Драпкінай?




ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ
(6 ХВ)

Напрыканцы занятку настаўнік прапануе на аснове прагледжанага фільма выканаць практыкаванне:
https://learningapps.org/watch?v=p0fsr3ymc21

Пры правядзенні рэфлексіі настаўнік просіць вучняў назваць адно слова (паняцце, імя, загаловак), якое, на іх думку, было найбольш важным на занятку.

*Ірына Бернат*

**ДАДАТАК 1**

# Урыўкі з успаміну да часткі I. Нацыянальная ідэнтычнасць

## ПРА СЯМ’Ю

Мае бабуля і дзядуля з боку бацькі памерлі да майго нараджэння, а ўсе мае сваякі па матчынай лініі былі жывыя і жылі ў Мінску.

Бабуля па матчынай лініі памерла ў 1934 г.; яе звалі Дзіна-Рэйзл Хаютоўская. Яна была хатняй гаспадыняй, маці 10 дзяцей: 7 дачок і 3 сыноў. Я вельмі добра памятаю бабулю: яна часта брала мяне на шпацыр, і мы шмат размаўлялі. Памятаю, аднойчы я спытала ў яе: «Бабуля, а Бог ёсць?» Бабуля сказала, што не ведае, і папрасіла мяне не пытацца пра гэта дзядулю. Бабуля не насіла парык або хустку, але дома яна выконвала кашрут і адзначала святы.

Майго дзядулю (бацьку мамы) звалі Эль Хаютоўскі, але мы ўсе называлі яго дзядуля. Ён нарадзіўся ў 1870 г., а загінуў у Мінскім гета ў 1941 г. Ён быў вельмі набожны чалавек: ён ніколі не еў па-за домам, бо кашрут нідзе навокал не выконвалі. Дарэчы, мае бацькі не выконвалі кашрут. Толькі адна наша сваячка, мая цётка Соня, выконвала кашрут, калі яна жыла разам з дзядулем і бабуляй. Пасля смерці бабулі яна жыла з дзядулем і гатавала для яго кашэрную ежу. Потым яна выйшла замуж, але па-ранейшаму выконвала кашрут.

Мама з татам гаварылі на ідышы паміж сабой, а мы (дзеці) разумелі іх, але яны не вучылі нас пісаць і чытаць на мове ідыш. Калі мне было 8 гадоў, у Беларусі яшчэ працавала некалькі яўрэйскіх школ, але крыху пазней улады іх зачынілі.

Я не ведаю, як пазнаёміліся мае бацькі, як праходзіла іх вяселле, але, думаю, усё было згодна з яўрэйскімі традыцыямі, так як дзядуля быў вельмі рэлігійны чалавек.

У нашай сям’і не выконвалі яўрэйскія традыцыі, але на Песах да нас прыходзіў дзядуля, прыносіў мацу, нейкае вельмі смачнае віно і прасіў нас усіх яго пакаштаваць. Яўрэйскія традыцыі ў нашай сям’і не выконвалі: мы жылі ў савецкім грамадстве.

## ПРА АДУКАЦЫЮ

Усе дзеці хацелі вучыцца, але такой магчымасці не было: у той час (пры цары) у дачыненні да яўрэяў ужывалася пяціпрацэнтная квота. Старэйшыя дзеці (мая мама, цётка Маня і цётка Соня) скончылі гімназію ў Мінску.

## ПРА ДЗЯДУЛЮ І БАБУЛЮ

Дзядуля выконваў яўрэйскія традыцыі, наведваў сінагогу. Заўсёды насіў капялюш. Памятаю, калі ён маліўся, ён накладаў тфілін на лоб і руку. У яго таксама меўся таліт.

Дзядуля і бабуля размаўлялі паміж сабой на мове ідыш, але яны таксама маглі размаўляць на рускай. Я дрэнна памятаю іх дом, так як мы жылі асобна.

У той час я нічога не ведала пра яўрэйскую суполку Мінска. Дзядуля хадзіў у сінагогу і там, мабыць, меў зносіны з членамі абшчыны.

## ПРА ТАТУ І МАМУ

Мой тата, Левін Ошэр Гіршэвіч, нарадзіўся ў Мінску ў 1891 г. Яго калегі называлі яго Оскар Рыгоравіч; ён працаваў настаўнікам яўрэйскай і рускай моў, а потым (калі я была ў восьмым ці дзявятым класе) стаў працаваць бухгалтарам. У яго заўсёды было слабое здароўе: у яго былі праблемы са зрокам, і ён увесь час насіў акуляры.
Мы страцілі тату ў Мінскім гета ў 1941 г.

Мая мама нарадзілася ў Мінску ў 1895 г., і яе жыццё скончылася ў Мінскім гета 20 лістапада 1941 г. Яе дзявочае прозвішча — Хаютоўская.

Яе яўрэйскае імя было Гінда Эльеўна, але ўсе яе клікалі Яўгенія Ільінічна. Мама скончыла гімназію ў Мінску і працавала ў Мінскім гарвыканкаме. Верагодна, тата не мог адзін утрымліваць нашу сям’ю, таму мама вымушана была працаваць.

## ПРА ЖЫЦЦЁ Ў ГЕТА

Памятаю, аднойчы, ужо ў гета, прыйшоў дзядуля (верагодна, гэта быў Ём Кіпур) і сказаў: «Гінда, ты сёння не давай дзецям есці хоць бы да дванаццаці гадзін». З ежы ў нас тады была толькі крупы з вадой. Мама запярэчыла, сказаўшы, што мы і так галадаем. Тым не менш дзядуля папрасіў яе пацярпець да дванаццаці гадзін.
Я чула іх размову, але тады не зразумела яе сэнс. Цяпер я разумею, што гэта быў Ём Кіпур, калі людзі павінны трымаць пост, а ўжыванне ежы забаронена.

## ПАСЛЯ ВАЙНЫ

Сур’ёзна вывучаць традыцыю я пачала толькі цяпер, так як у савецкі час у нас не было такой магчымасці. Шкада, што я не ведаю іўрыту. Ідыш я трохі ведаю (я лепш разумею, чым гавару). Сыны пасталелі, усвядомілі сябе яўрэямі. Часам ходзяць у сінагогу, у дзень смерці другога мужа замаўляюць Кадзіш.

## ПРА ВЯСЕЛЛЕ З ПЕРШЫМ МУЖАМ

Мая будучая свякроў была вельмі набожным чалавекам і сказала, што яна прызнае толькі хупу. Ведаеце, хупа ў той час была раўназначная самагубству, так як мой муж быў сябрам партыі. Мы баяліся, але, тым не менш, ён пайшоў на гэтую рызыку. Я не пярэчыла, бо гэта было жаданне свекрыві. Быў выходны дзень, сваякі паехалі кудысьці ў Сестрарэцк або Зеленагорск і прывезлі рабіна. Адкрылі малую сінагогу, і там у нас была хупа. Так што вяселле прайшло і па яўрэйскай традыцыі, і па савецкіх правілах (зразумела, мы зарэгістравалі наш шлюб і ў ЗАГСе).

## ПРА ДРУГІ ШЛЮБ

Бацька другога мужа быў рабінам у Полацку ў Беларусі, дзе і нарадзіўся мой муж... У нашых сыноў ёсць сем’і, дзеці, а ў мяне — унукі. У старэйшага Аляксандра — яўрэйская сям’я.

Мой унук нарадзіўся ў 1975 г.

У шлюбе з другім мужам мы заўсёды адзначалі Песах, не забывалі Ём Кіпур. У доме была маца, фаршыраваная рыба, курыца. Вядома, мы не строга прытрымліваліся яўрэйскіх традыцый, але стараліся неяк адзначаць святы.

# ДАДАТАК 2

## Памятка
## “Як весці дыскусію”

1. **Перад тым як спрачацца, падумай, што менавіта ты павінен сказаць.**
2. **Выкажы і аргументуй сваё меркаванне.**
3. **Гавары проста і ясна, лагічна і паслядоўна.**
4. **Гавары толькі тое, што цябе цікавіць, што ты ведаеш, у чым ты ўпэўнены, не сцвярджай таго, у чым сам не ўпэўнены.**
5. **Спрачайся шчыра: не перакручвай думкі чалавека, з якім ты не згодны.**
6. **Не паўтарайся і не паўтарай слоў іншых.**
7. **Помні, што лепшыя доказы — дакладныя факты.**
8. **Паважай таго, хто спрачаецца з табой; твае тактоўныя паводзіны доказваюць, што ты не толькі моцны апанент, але і выхаваны чалавек.**



ДЗЯДЗЯ АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ ПА МАЦЯРЫНСКАЙ ЛІНІІ ДАВІД ХАЮТОЎСКІ (ВЕНГРЫЯ, 1945)

## **ТЭМА ЗАНЯТКУ:** ЯЎРЭІ МІНСКА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ.: ТРАДЫЦЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ І САВЕТЫЗАЦЫЯ

| | |
|---|---|
| МЭТАВАЯ ГРУПА | навучэнцы ад 14 год. |
| ПРАЦЯГЛАСЦЬ | 45 хв (прагляд фрагмента фільма (3 хв), групавая праца (20 хв), праца ў класе (15 хв) + папярэдні ўступ настаўніка (7 хв). |
| МЭТА | на прыкладзе гісторыі сям'і Алены Драпкінай разглядзець працэс саветызацыі яўрэяў у БССР. |
| ЗАДАЧЫ | - вывучыць алгарытм працы з фотаздымкамі;<br>- стварыць умовы для развіцця ўменняў для працы з фота- і відэаматэрыяламі;<br>- пазнаёміць з яўрэйскімі традыцыямі і звычаямі. |
| ФОРМЫ ПРАЦЫ | франтальная, групавая, індывідуальная. |
| МЕТАДЫ | гутарка, дыскусія, метад праектаў. |
| МАТЭРЫЯЛЫ | відэафрагмент фільма пра Алену Драпкіну; фотаздымкі яе сям'і, даваеннага Мінска; урыўкі з яе ўспамінаў, працоўныя лісты, копія карты горада Мінска, налепкі. |

### **ЧАСТКА I.** МІНСК САВЕЦКІ ЦІ ЯЎРЭЙСКІ? (20 ХВ)

I. Перад праглядам відэафрагмента настаўнік задае заданне:

*Запішыце аб'екты Мінска, якія вы пазнаяце ва відэафрагменце. Ці існуюць яны цяпер?*

II. Настаўнік паказвае навучэнцам відэафрагмент з фільма пра Алену Драпкіну 0:00–0:52 (даваеннае жыццё і яго жыхары; месца горада на карце БССР). Пасля прагляду класу ставяцца пытанні:
- *Хто пражываў у даваенным Мінску? Падумайце, якія былі ў іх заняткі.*
- *Якія аб'екты Мінска, звязаныя з гісторыяй яўрэяў, вы ведаеце?*

III. Пасля адказаў на пытанні навучэнцы атрымліваюць копію карты Мінска і налепкі, якія сімвалізуюць аб'екты, звязаныя з яўрэйскай спадчынай (гл. **ДАДАТАК 1**). Іх трэба змясціць на карце.

IV. Настаўнік прапаноўвае навучэнцам абмеркаваць фотаздымкі міжваеннага перыяду, на якіх захаваныя шыльды на будынках на чатырох мовах (гл. **ДАДАТАК 2**). Навучэнцы спрабуюць вызначыць:
1. *прадстаўнікі якіх нацыянальнасцей пражывалі ў гэты перыяд;*
2. *на якіх мовах напісаны шыльды і чаму.*

V. Даміно "ЯЎРЭЙСКІЯ ТРАДЫЦЫІ , ЗВЫЧАІ, СВЯТЫ".

Настаўнік раздае вучням карткі (гл. **ДАДАТАК 3**), на якіх прадстаўлены паняцці, звязаныя з яўрэйскімі традыцыямі і культурай. Задача навучэнцаў — правільна суаднесці паняцці і іх вызначэнні.

Для таго каб зразумець, што адбывалася з яўрэйскай абшчынай у міжваенны перыяд, навучэнцы глядзяць відэафрагмент фільма (0:53—2:51) пра даваенную гісторыю сям'і Алены Драпкінай. Затым адказваюць на пытанне, пацвердзіўшы свой адказ фактамі з убачанага:

*У чым праяўлялася саветызацыя яўрэяў?*

Настаўнік дае кароткае тлумачэнне саветызацыі яўрэяў у міжваенны час і паказвае змены ў іх штодзённасці, якія адбыліся з імі ў гэты перыяд.

**ЧАСТКА II.**
## СЯМ’Я АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ
(20 ХВ)

I. ПРАЦА З ФОТАЗДЫМКАМ
Настаўнік дзеліць вучняў на некалькі груп (у залежнасці ад колькасці фотаздымкаў, з якімі ён хоча папрацаваць (гл. **ДАДАТАК 4**). Кожная група атрымлівае фотаздымак і працоўны ліст (гл. **ДАДАТАК 5**).

Вынікі сваёй працы з фотаздымкам групы прадстаўляюць адказамі на пытанні, якія знаходзяцца на працоўным аркушы. Пасля абмеркавання атрыманых вынікаў групам раздаюцца фрагменты ўспамінаў (гл. **ДАДАТАК 6**), якія могуць папоўніць тыя прабелы, што засталіся пасля працы з фотаздымкамі.

ПАРАДЫ НАСТАЎНІКУ
**ЯК ПРАЦАВАЦЬ З ФОТАЗДЫМКАМ**

**Фотаздымак — адна з надзейных і навочных крыніц аб мінулым. Але пры гэтым нельга забываць, што з яго дапамогай можна маніпуляваць успрыняццем рэчаіснасці. На якія асноўныя моманты трэба звярнуць увагу пры працы з фотаздымкам:**

- **Што фіксуе фотаздымак?**
- **Хто на ім адлюстраваны?**
- **Фотаздымак пастановачны ці выпадковы?**
- **З якой падзей звязаны ці чаму прысвечаны здымак?**
- **Хто аўтар фотаздымка і калі ён быў зроблены?**

**Стратэгія працы з фотаздымкам:**

- **супастаўленне фатаздымкаў, г.зн. параўнанне з іншымі выявамі;**
- **прывядзенне ў адпаведнасць з іншымі крыніцамі, напрыклад лістамі, дзённікамі, актамі і г.д. Амаль заўседы існуюць таксама тэксты, якія паведамляюць пра тую ж падзею.**

**Гэта можа быць пратакол спартыўнага таварыства аб спартыўным мерапрыемстве, ліст ці вытрымка з дзённіка аб асабістым перажыванні. Інтэрв’ю сведак таксама могуць дапамагчы. Гаворка ідзе пра рэканструкцыю кантэксту здымка — абставін, у якіх ён з’явіўся. Толькі так атрымоўваецца зразумець, які эпізод рэчаіснасці быў захаваны.**


АЛЕНА ДРАПКІНА СЯРОД ІНШЫХ СТУДЭНТАЎ (ЛЕНІНГРАД, СССР, 1948)

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ
(5 ХВ)

Навучэнцам прапаноўваецца назваць тры моманты, якія ў іх атрымаліся добра падчас занятку, і прапанаваць адно дзеянне, якое палепшыць іх працу на наступным занятку.

*Таццяна Гайдук*

## ДАДАТАК 1

## Яўрэйская спадчына ў Мінску




https://yandex.by/maps/157/minsk/?ll=27.561481%2C53.902496&z=12




Сінагога




Музей




Мемарыял

# ДАДАТАК 2

## Калаж з фотаздымкаў даваеннага Мінска










Спіс выкарыстаных ілюстрацый:

1. 1.Герб БССР [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: https://isralove.org/_ld/15/37145985.jpg

   Дата доступа: 30.08.2021.

2. Кнігарня “Логвінаў” сделала вывеску на 5 языках — и это очень круто. [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://citydog.by/post/zaden-lohvinau-9758/

   Дата доступа: 09.03.2021.

3. Будынак Віленскага вакзала [Электроны рэсурс]. Рэжым доступа: https://isralove.org/_ld/15/81080740.jpg

   Дата доступа: 09.03.2021.

## ДАДАТАК 3

# Гістарычнае даміно

| | |
|---|---|
| **Бар-міцва** | Дасягненне яўрэйскім хлопчыкам ці дзяўчынкай рэлігійнага паўналецця. Для хлопчыкаў гэта 13 год і 1 дзень, для дзяўчынак — 12 год і 1 дзень. Лічыцца таксама момантам перахода з дзяцінства ў дарослае жыццё. |
| **Кашрут** | Тэрмін у іўдаіцы, які пазначае дазвол ці прыдатнасць чагосьці з пункту гледжання рэлігійных правілаў. У іўдаізме ён выкарыстоўваецца не толькі ў адносінах да харчавання, але і ў іншых аспектах традыцыйнага жыцця. |
| **Пурым** | Самае вясёлае свята, прысвечанае цудоўнаму выратаванню яўрэйскага народа ад вынішчэння ў часы персідскага рабства. Галоўная страва свята гаменташэн — піражкі трохвугольнай формы з разынкамі і макам. |
| **Сінагога** | Малітоўны дом у яўрэяў. Месца грамадскага набажэнства ды цэнтр рэлігійнага жыцця абшчыны. Ён будуецца так, каб яго фасад заўсёды быў накіраваны на Ізраіль ці па магчымасці на Іерусалім. |
| **Ханука** | Яўрэйскае свята свечак, якія запальваюць у гонар цуда, якое адбылося пры асвячэнні Храма пасля перамогі войска Іегуды Макавея над войскамі цара Антыоха ў 164 г. да н.э. Пры надыходзе вечара на падваконніку ці на ўваходзе ў дом запальваецца свяцільня (ханукіе). Кожны дзень дадаецца новы агеньчык, пакуль іх агульная колькасць не дасягне васьмі. У Хануку паводле звычаю гатуюць бульбяныя аладкі ды пончыкі. |
| **Хупа** | Балдахін, пад якім яўрэйская пара стаіць падчас шлюбу, а таксама сама цырымонія. Яна можа ўяўляць сабой тканіну ці прасціну, нацягнутую ці падтрыманую чатырма жэрдкамі. |
| **Шабат** | Час адпачынку ды зносін з сябрамі ды родзічамі. У гэтае свята нельга нават запальваць святло, жанчыны запальваюць свечкі ў пятніцу і ставяць іх на святочны стол. |

## ДАДАТАК 4

## Фотаздымкі сям’і Алены Драпкінай

| Фота | Апісанне | Спасылка |
|---|---|---|
|  | Цёця Алены Драпкінай па матчынай лініі. Гэты фотаздымак быў зроблены ў Мінску ў 20-я гг. XX ст. На ім — цёця Соня Хаютоўская. | https://pamjat.centropa.org/ru/foto/elena-drapkinas-maternal-aunt-ru/ |
|  | Бабуля Алены Драпкінай па матчынай лініі. Фотаздымак зроблены ў 1927 г. у Мінску. Бабулі было тады 53 гады. | https://pamjat.centropa.org/ru/foto/1168/ |
|  | Бацькі Алены Драпкінай. На фотаздымку Ошэр і Гінда Левіны. Здымак зроблены ў Мінску ў 1920 г. | https://pamjat.centropa.org/ru/foto/elena-drapkinas-parents-ru/ |
|  | Гэты здымак зроблены ў Мінску ў 1940 г: Алена была тады школьніцай. У 1941 г. (непасрэдна перад вайной) яна скончыла 9 класаў. | https://pamjat.centropa.org/ru/foto/elena-drapkina-1940-ru/ |

# ДАДАТАК 5

## Працоўны аркуш

| | | |
|---|---|---|
| 1. Што прадстаўлена на фотаздымку? На якія аб’екты фатограф звяртае ўвагу? Якой падзеі прысвечаны фотаздымак? | | |
| 2. Што робяць людзі, якія прысутнічаюць на здымку? | | |
| 3. Ці ёсць на здымку дадатковыя крыніцы інфармацыі (плакаты, улёткі і г.д.)? | | |
| 4. На якія пытанні не можа адказаць гэты фотаздымак? | | |
| 5. Якой інфармацыі вам не хапіла для паўнаты ўспрымання выявы? | | |

# ДАДАТАК 6

## Фрагменты ўспаміну Алены Драпкінай

ФРАГМЕНТ ДА ФОТАЗДЫМКА 1. ЦЁЦЯ СОНЯ

Толькі адна наша сваячка, мая цёця Соня, падтрымлівала кашрут, калі яна жыла разам з дзедам і бабуляй. Пасля смерці бабулі яна жыла с дзедам і гатавала яму кашэрную ежу. Пасля яна выйшла замуж, але працягвала падтрымліваць кашрут.

Цёця Соня вырашыла хадзіць на заняткі ў фармацэўтычную школу ў Мінску замест з'ехалай сястры, але ёй там сказалі: "Хаютоўская, вы крадзеце ў нас заняткі".

ФРАГМЕНТ ДА ФОТАЗДЫМКА 2. БАБУЛЯ

Бабуля па матчынай лініі памерла ў 1934 г.; яе звалі Дзіна-Рэйлз Хаютоўская. Яна была хатняй гаспадыняй, маці 10 дзяцей: 7 дочак і 3 сыноў. Я вельмі добра памятаю бабулю: яна часта брала мяне на шпацыр, і мы шмат размаўлялі. Памятаю, аднойчы я запытала яе: "Бабуля, а Бог есць?" Бабуля сказала, што не ведае, і папрасіла мяне не пытаць аб гэтым дзядулю. Бабуля не насіла парык ці хустку, але дома яна выконвала кашрут і адзначала святы.

ФРАГМЕНТ ДА ФОТАЗДЫМКА 3. БАЦЬКІ

Мой тата, Левін Ошэр Гіршавіч, нарадзіўся ў Мінску ў 1891 г. Яго калегі называлі яго Оскар Рыгоравіч; ён працаваў настаўнікам яўрэйскай і рускай мовы, а пасля (калі я была ў восьмым ці дзявятым класе) пачаў працаваць бухгалтарам. У яго заўсёды было слабое здароўе: у яго былі праблемы са зрокам, і ён пастаянна насіў акуляры. Мы страцілі тату ў Мінскім гета ў 1941 г.

Мая маці нарадзілася ў Мінску в 1895 г., і яе жыццё скончылася ў Мінскім гета 20 лістапада 1941 г. Яе дзявочае прозвішча — Хаютоўская. Яе яўрэйскае імя было Гінда Эльеўна, але ўсе звалі яе Яўгенія Ільінічна. Мама скончыла гімназію ў Мінску і працавала ў Мінскім гарвыканкаме. Верагодна, тата не мог адзін забяспечваць нашу сям'ю, таму маці вымушана была працаваць.

Тата выпісваў газету "Працоўны", мне — дзіцячы часопіс "Мурзілка", газету "Піянерская праўда", "Маскоўская праўда" і мясцовую беларускую газету.

Мама і тата размаўлялі на ідыш паміж сабой, а мы (дзеці) разумелі іх, але яны не вучылі нас пісаць і чытаць на ідыш. Калі мне было 8 год, у Беларусі яшчэ працавала некалькі яўрэйскіх школ, але крыху пазней улады іх зачынілі.

У бацькі было шмат кніг: я памятаю кнігі Чарнышэўскага і Герцэна. Мама чытала менш, так як яна працавала : у яе не было памочнікаў, а ёй трэба было прыбрацца ў хаце, прыгатаваць ежу.

З працы яна прыходзіла позна вечарам, але тата ёй вельмі дапамагаў. Памятаю такі выпадак: мама неяк прыйшла з працы і прылягла адпачыць, а тата прыйшоў ды пацалаваў яе на вачах у нас, у дзяцей (думаю, гэта быў такі выхаваўчы момант, тата хацеў паказаць дзецям прыклад правільных адносін паміж членамі сям'і). Папа шмат чытаў, шмат ведаў: увогуле граў ролю "першай скрыпкі" ў нашай сям'і. У раённую бібліятэку мы не хадзілі: у кожнай школе была ўласная бібліятэка, дзе мы бралі кнігі для чытання.

Мае бацькі не былі членамі партыі. Я нічога не ведаю аб іх палітычных поглядах, так як на гэтую тэму нельга было гаварыць.

У папы, магчыма, быў "белы білет" [«белабілетнікам» называлі чалавека, які быў вызвалены ад абавязковай вайсковай службы па стане здароўя]. У яго з дзяцінства былі праблемы са зрокам, і ён заўсёды насіў акуляры.

ФРАГМЕНТ ДА ФОТАЗДЫМКА 4. АЛЕНА ДРАПКІНА

Я нарадзілася ў 1924 г. у Мінску, у сям'і Левіных (Ошэра Гіршавіча і Гінды Эльеўны).

Мае браты і я вучыліся ў школе. Перад вайной я скончыла дзявяты клас. Памятаю, калі я вучылася ў трэцім класе, я займалася на дзіцячай тэхнічнай станцыі, дзе мы спрабавалі вырошчваць бавоўну. Бавоўна ў мяне вырасла вялікая, але не саспела: ёй не хапала сонечнага цяпла. У Доме ўрада была выстава, дзе была прадстаўлена і мая бавоўна.

Мы жылі каля ракі, і ў 12 год я ўжо добра плавала. Усе дзеці павіны былі здаваць нарматывы для юных спартсменаў на атрыманне значка ГПА ("Гатовы да працы і абароны"). На спаборніцтвах мяне заўважыў трэнер і запрасіў у сваю спартыўную групу. Я пагадзілася. У Мінску ў тыя часы быў усяго адзін басейн — у Доме Чырвонай арміі; я пачала займацца там плаваннем (стыль брас) у гарадскім спартыўным таварыстве. У мяне было некалькі рэкордаў Беларусі ў гэтым разрадзе, а таксама 6 месца ў Саюзе па разрадзе майго ўзросту (12–14 гадоў). Я ўдзельнічала ва ўсесаюзных спаборніцтвах пяці гарадоў у Кіеве і ва ўсесаюзных спаборніцтвах у Тбілісі. Дзеці прыязджалі туды з усіх рэспублік. Было гэта ў 1939 г. Адначасова я займалася ў Дварцы піянераў у драматычным гуртку; там я пазнаёмілася з Машай Брускінай.

Такім было мае дзяцінства; яно не было цяжкім. Мой старэйшы брат вучыўся ў школе да вайны, а пасля пачатку вайны пайшоў у армію. Больш я пра яго нічога не ведаю па сённяшні дзень. Пасля вайны я пісала ва ўсесаюзны пошук; мне адказалі, што ён не лічыцца сярод загінулых на фронце, памерлых ад ран ці зніклых без звестак.



ГІРШ, СТАРЭЙШЫ БРАТ АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ. І ЯГО СЯБРЫ (МІНСК, 1940)

## **ТЭМА ЗАНЯТКУ:** БІЯГРАФІЯ АСОБЫ ЯК ЧАСТКА ГІСТОРЫІ

| | |
|---|---|
| МЭТАВАЯ ГРУПА | навучэнцы ад 14 гадоў. |
| ПРАЦЯГЛАСЦЬ | 45 хв (уступнае слова настаўніка (2 хв), прагляд фільма (14 хв), праца ў групах з біяграфіяй (17 хв), праца з фотаздымкамі (10 хв), падвядзенне вынікаў (2 хв). |
| МЭТА | развіццё ўмення працы з біяграфічным матэрыялам на прыкладзе біяграфіі Алены Драпкінай. |
| ЗАДАЧЫ | - пазнаёміць вучняў з алгарытмам працы з біяграфічным матэрыялам;<br>- арганізаваць працу па вывучэнні біяграфіі сведкі падзей Другой сусветнай вайны ў кантэксце агульнагістарычных падзей. |
| ФОРМЫ ПРАЦЫ | франтальная, групавая, індывідуальная. |
| МЕТАДЫ ПРАЦЫ | даследчы, дыскусія, прэзентацыя і інш. |
| МАТЭРЫЯЛЫ | фільм пра Алену Драпкіну; лісты з транскрыпцыяй тэксту фільма (для кожнай групы); фатаграфіі Алены Драпкінай і асоб, згаданых у фільме (на экране медыяпраектара); карткі з імёнамі людзей, згаданых у фільме. |

Праца з біяграфіяй Алены Драпкінай (як і з іншымі біяграфіямі) дазволіць вучням не толькі навучыцца працаваць з рознымі відамі гістарычных крыніц — пісьмовымі, кіна- і фотадакументамі. Іх дзейнасць на дадзеным уроку дасць магчымасць сучасным падлеткам адчуць дачыненне да таго, што адбывалася з аднагодкамі і іх блізкімі ў гады Другой сусветнай вайны, зразумець гісторыю “знутры”.

**ЧАСТКА I.**
## ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ
(16 ХВ)

### ПАРАДА НАСТАЎНІКУ

**Перад праглядам фільма варта прапанаваць вучням запісваць у сшытак незразумелыя словы або пытанні, якія ўзнікаюць падчас прагляду. Пасля прагляду неабходна адказаць на пытанні і растлумачыць незразумелыя словы і выразы.**

Настаўнік дэманструе калаж з фотаздымкаў (гл. **ДАДАТАК 1**) і тлумачыць, што адно з заданняў пасля прагляду будзе звязана з вызначэннем таго, хто гэтыя людзі і якую ролю яны адыгралі ў жыцці Алены Драпкінай

**ЧАСТКА II.**
## АДНА З МНОГІХ — ЛЁС ЧАЛАВЕКА Ў ГІСТОРЫІ КРАІНЫ
(17 ХВ)

Настаўнік дзеліць клас на 4 групы. Кожная група атрымлівае заданне: адказаць на пытанні да вызначанага перыяду ў жыцці гераіні біяграфіі. Пасля выканання заданняў групы прэзентуюць вынік сваёй працы.

### ГРУПА 1.
СЯМ’Я, ЖЫЦЦЁ ДА ВАЙНЫ

Прыкладныя пытанні:

- Дзе і калі нарадзілася Алена Драпкіна? Раскажыце пра яе сям’ю
- Якую адукацыю атрымала Алена да вайны?
- Як Алена ставілася да рэлігіі? Хто з членаў сям’і пазнаёміў дзяўчынку з асновамі іўдаізму?
- Чым Алена займалася ў вольны час? З кім яна сябравала?
- Якія дзіцячыя ўспаміны захаваліся ў памяці Алены? Якім было яе даваеннае дзяцінства?

### ГРУПА 2.
АКУПАЦЫЯ, ЖЫЦЦЁ Ў ГЕТА

Прыкладныя пытанні:

- Як Алена апісвае пачатак вайны? Якое пачуццё адольвае яе пры гэтай вестцы?
- Як сям’я Алены спрабавала выратавацца ад надыходзячай нацысцкай арміі? Чым скончылася гэтая спроба?
- Чаму сям’я Алены была вымушана змяніць месца жыхарства? Якія былі іх жыллёвыя ўмовы на новым месцы?
- Што распавядае Алена пра стаўленне нацыстаў да насельніцтва гета?
- Коратка раскажыце, як Алена страціла родных. Што дапамагло ёй выжыць?

### ГРУПА 3.
УЦЁКІ, УДЗЕЛ У ПАРТЫЗАНСКАЙ БАРАЦЬБЕ

Прыкладныя пытанні:

- Чаму Алена вырашыла збегчы з гета? Як былі арганізаваныя ўцёкі? Хто дапамог ёй збегчы?
- Як вы лічыце, чаму людзі дапамагалі Алене і іншым уцекачам, рызыкуючы пры гэтым сваім жыццём?
- Як Алена трапіла ў партызанскі атрад? Раскажыце пра яе ўдзел у баявых дзеяннях?
- Дзе і пры якіх умовах Алена сустрэла вызваленне Беларусі Чырвонай Арміяй?
- З якімі пачуццямі ўспамінае Алена свой удзел ва ўзброенай барацьбе?

### ГРУПА 4.
ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ВАЙНЫ

Прыкладныя пытанні:

- Дзе жыла і чым займалася Алена пасля вайны? Што прымусіла яе вырашыцца на пераезд? Чаму яна пераехала менавіта ў Ленінград?
- Якую адукацыю атрымала Алена? Кім яна працавала? Ці любіла яна справу, якой займалася?
- Раскажыце пра асабістае жыццё гераіні фільма, пра яе сям’ю.
- Ці займалася Алена грамадскай дзейнасцю? Чым менавіта?
- Што змянілі ваенныя выпрабаванні ў адносінах Алены да жыцця, да рэлігіі? У чым яна знаходзіць суцяшэнне пасля перанесеных выпрабаванняў і страт?

**ЧАСТКА III.**
ТЫЯ, ХТО БЫЎ ПОБАЧ
(10 ХВ)

Пасля прагляду фільма на экран выводзіцца калаж з фотаздымкаў людзей, згаданых у фільме (гл. **ДАДАТАК 1**). Навучэнцы атрымліваюць заданне знайсці ў тэксце урыўкаў успамінаў Алены Драпкінай (гл. **ДАДАТАК 3**) імёны гэтых людзей, распавесці пра іх ролю ў жыцці гераіні фільма, іх лёс. Звярніце ўвагу вучняў на тое, што ў цэнтры калажу змешчаны партрэт Алены Драпкінай.

Групы адказваюць па чарзе, распавядаючы пра аднаго з персанажаў. Іншыя групы маюць права дапоўніць або выправіць адказ. Затым дэманструецца аркуш з адказамі (гл. **ДАДАТАК 2**).

ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ
(2 ХВ)

У канцы ўрока можна правесці рэфлексію, напрыклад папрасіць адказаць на пытанні:

- Што новага я даведаўся сёння?
- Ці ёсць у мяне і ў гераіні фільма агульныя захапленні, інтарэсы?
- Якое пытанне я б задаў Алене Драпкінай?

*Людміла Гурыновіч*

## ДАДАТАК 1

### Тыя, хто быў побач

1.


2.


3.




4.


5.


6.


## ДАДАТАК 2

Тыя, хто быў побач (адказы).

1. Левіны Ошэр і Гінда
2. Брускіна Маша
3. Хаютоўская Соня
4. Свердлін Лейб
5. Драпкіны Барыс і Вульф
6. Драпкін Аляксандр

## ДАДАТАК 3

Урыўкі з успаміну Алены Драпкінай

### МІРНАЕ ЖЫЦЦЁ

1. Майго дзядулю (бацьку маці) клікалі Эль Хаютоўскі, але мы ўсе называлі яго дзядуля. Ён нарадзіўся ў 1870 г., а загінуў у Мінскім гета ў 1941 г. Ён быў вельмі набожны чалавек: ён ніколі не еў па-за домам, бо кашрут нідзе вакол не выконвалі. ... Толькі адна наша сваячка, мая цётка Соня, выконвала кашрут, калі яна жыла разам з дзядулем і бабуляй. Пасля смерці бабулі яна жыла з дзядулем і гатавала для яго кашэрную ежу. Потым яна ўзяла шлюб, але па-ранейшаму выконвала кашрут.
2. Мой тата, Левін Ошэр Гіршавіч, нарадзіўся ў Мінску ў 1891 г. Яго калегі называлі яго Оскар Рыгоравіч; ён працаваў настаўнікам яўрэйскай і рускай моў, а потым (калі я была ў восьмым ці дзявятым класе) стаў працаваць бухгалтарам.
3. Мая мама нарадзілася ў Мінску ў 1895 г. Яе дзявочае прозвішча — Хаютоўская. Яе яўрэйскае імя было Гінда Эльеўна, але ўсе яе клікалі Яўгеніяй Ільінічнай. Мама скончыла гімназію ў Мінску і працавала ў Мінскім гарвыканкаме.
4. У нашай сям'і было трое дзяцей: старэйшы брат Гірш, названы ў гонар дзядулі з боку бацькі. Гірш нарадзіўся ў 1920 г. Затым я, Алена (1924 г. нар.), і мой малодшы брацік Саул 1929 г. нар. Саула мы страцілі 20 лістапада 1941 г. у Мінскім гета разам з мамай.
5. У Мінску ў тыя часы быў усяго адзін басейн — у Доме Чырвонай арміі; я пачала займацца там плаваннем (стылем брас) у гарадскім спартыўным таварыстве. У мяне было некалькі рэкордаў Беларусі ў гэтым разрадзе, а таксама шостае месца па Саюзе ў разрадзе дзяўчынак майго ўзросту (12–14 гадоў). Я ўдзельнічала ва ўсесаюзных спаборніцтвах пяці гарадоў у Кіеве і ва ўсесаюзных спаборніцтвах у Тбілісі. Дзеці прыязджалі туды з усіх рэспублік. Было гэта ў 1939 г. Адначасова я займалася ў Палацы піянераў у драматычным гуртку; там я пазнаёмілася з Машай Брускінай.

### ЖЫЦЦЁ Ў ПЕКЛЕ

1. ...Дзядзька вярнуўся і паведаміў нам пра паліцэйскіх. Мы ўсё зразумелі, бо мае дзядуля і цётка загінулі 7 лістапада ў такой жа аблаве. Я адразу ж ускочыла, штосьці на сябе накінула і кінулася пад лесвіцу. Там ужо было поўна народу, за мной туды яшчэ паспеў ускочыць сын дзядзькі Толі Міша. Там мы прабылі суткі. ...Немцы заходзілі ў дамы, прачэсвалі пакоі і ўсіх выводзілі. Мы чулі ўсё, што адбывалася навокал: як падымаюцца па лесвіцы ўверх і ўніз, як мая мама сказала: «Адну хвілінку, я паліто апрану». Усіх маіх сваякоў вывезлі за межы Мінска і расстралялі.
2. ...мы гаварылі пра гэта з Машай Брускінай і меркавалі, што дзесьці ёсць падпольная арганізацыя. Але Маша была павешаная немцамі 26 кастрычніка.
Падчас нямецкай акупацыі Маша ўладкавалася на працу ў шпіталь, размешчаны за межамі гета. Немцы не дапускалі яўрэяў да працы там. Маша асвятліла валасы і ўладкавалася туды на працу. Калі параненыя здаравелі, іх звычайна накіроўвалі ў Германію на прымусовыя работы. Каб іх выратаваць, Маша недзе здабывала грамадзянскую вопратку і дапамагала ім выйсці на партызан. Але гэта не магло працягвацца вечна: хтосьці данёс немцам на Машу. Немцы правялі паказальную экзекуцыю і павесілі Машу на адной з плошчаў Мінска.

### НОВЫ ПАЧАТАК

1. А ў 1946 г. я выйшла замуж. Мой муж, Драпкін Вульф Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1921 г. у Гарадку. Ва ўзросце двух месяцаў бацькі прывезлі яго ў Ленінград; школу ён скончыў таксама ў Ленінградзе. У мужа былі яшчэ брат і дзве сястры. Перад вайной ён скончыў ваеннае вучылішча сувязі, атрымаў прызначэнне на Далёкі Усход і вайну сустрэў у цягніку, калі ехаў па прызначэнні. Падчас вайны ён служыў у Іране, у Сярэдняй Азіі. Там ён перахварэў на брушны тыф і малярыю і падарваў сваё здароўе. У 1945 г. ён прыехаў у Ленінград і паступіў у Ваенную акадэмію радыёэлектронікі імя Будзённага. У 1946 г. мы пазнаёміліся ў доме маёй цёткі, куды мой будучы муж прыйшоў па справе. І ён, і я скончылі першы курс і ўлетку пажаніліся.
2. 9 мая (у Дзень Перамогі) 1947 г. я нарадзіла сына. Мой сын Аляксандр Драпкін нарадзіўся моцным, здаровым хлопчыкам. 27 чэрвеня 1949 г. мой муж раптоўна памёр. Гэта адбылося ў трамваі. Ён сказаў пасажырам, што яму дрэнна, і ўсё.
3. Жылі мы разам з яго бацькамі яшчэ 3 гады. Яго бацькі страцілі двух сыноў, на фота, якое я вам дала, муж з братам сфатаграфаваныя ў Маскве на зборах сувязістаў.
4. У 1959 г. я пазнаёмілася з Лейбам Беравічам Свердліным. Да таго часу ў яго памерла жонка, і ён застаўся адзін з двума сынамі: Вадзімам (1934 г. нар.) і Сашам (1944 г. нар.). Па спецыяльнасці ён быў будаўніком. Бацька другога мужа быў рабінам у Полацку ў Беларусі, дзе і нарадзіўся мой муж. У студзені 1960 г. мы пажаніліся. Вясельнай цырымоніі ў нас не было.
5. Мой сын Аляксандр вучыўся ў Вышэйшым ваенным вучылішчы сувязі імя Папова, а потым перайшоў на факультэт Інстытута сувязі імя Бонч-Бруевіча, які і скончыў. Цяпер ён — бізнесмен.



АЛЯКСАНДР ДРАПКІН З СЯБРАМІ (МАСКВА, СССР, 1965)

## **ТЭМА ЗАНЯТКУ:** ПЕРАЖЫЦЬ НЕМАГЧЫМАЕ (ЛЁС ВЯЗНЯ МІНСКАГА ГЕТА АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ)

**МЭТАВАЯ ГРУПА** навучэнцы ад 14 гадоў.

**ПРАЦЯГЛАСЦЬ** 45 хв (прагляд фільма (14 хв), групавая праца (10 хв), праца ў класе (10 хв), падвядзенне вынікаў (2 хв) + папярэднія ўводзіны настаўніка.

**МЭТА** выхаванне грамадзянскай адказнасці за свае паводзіны ў грамадстве на прыкладзе тэмы Другой сусветнай вайны.

**ЗАДАЧЫ**

- паказаць спосабы канструктыўна пераадольваць жыццёвыя перашкоды на прыкладзе лёсу аднаго з вязняў Мінскага гета;
- асэнсаваць уплыў выбару стратэгіі паводзін чалавека на лёсы іншых;
- падмацаваць важнасць прытрымлівання сістэмы каштоўнасцей, якая існуе ў грамадстве.

**ФОРМЫ ПРАЦЫ** франтальная, групавая, індывідуальная.

**МЕТАДЫ** мазгавы штурм, рашэнне праблемных сітуацый, дыскусія, прэзентацыя.

**МАТЭРЫЯЛЫ** фільм пра Алену Драпкіну, карткі з вызначэннем паняцця рэзільентнасці, урыўкамі ўспаміну Драпкінай да дзвюх частак заняткаў, копіямі храналогіі і біяграфіі сведкі з брашуры (колькасць копій адпавядае колькасці груп вучняў, можа быць большай, калі ў іх складзе больш за 4 чалавекі).

Фільм пра Алену Драпкіну створаны на падставе яе ўспаміну, які ўяўляе сабой значна большы матэрыял, чым мы бачым на відэа. На занятку прапануецца пагаварыць пра некалькі перспектыў, якія дае інтэрв'ю са сведкам у комплексе з праглядам фільма: пра спосабы пераадолення жыццёвых цяжкасцей гераіняй і пра тых, хто дапамагаў Алене выратавацца, нягледзячы на пагрозу смерці.

Пасля прагляду фільма ў двух модулях прапануецца выканаць заданні, выкарыстоўваючы дапаможныя матэрыялы (урыўкі з успаміну сведкі, яе біяграфію і храналогію ў брашуры).

**ЧАСТКА І.**
## АЛЕНА ДРАПКІНА І ЯЕ ПЕРААДОЛЕННЕ ТРАЎМЫ
(10 ХВ)

Настаўнік дзеліць клас на тры групы і далейшае выкананне заданняў у дадзенай частцы занятку праводзіць у форме групавой дыскусіі. Ад кожнай з груп выбіраецца выступоўца, які потым прадставіць вынікі
.

**ПСІХАЛАГІЧНАЯ РЭЗІЛЕНТНАСЦЬ**

**(або рэзільентнасць, ад англ. resilience — пругкасць, эластычнасць) — гэта прыроджаная дынамічная ўласцівасць асобы, якая палягае ў аснове здольнасці пераадольваць стрэсы і цяжкія перыяды канструктыўным шляхам. Нягледзячы на тое, што гэтая ўласцівасць прыроджаная, яе можна развіваць.**

Настаўнік дае тлумачэнне аб тым, як Другая сусветная вайна значна траўмавала кожнага з тых, хто жыў у той час, асабліва тых, хто, як Алена, перажыў глыбокую траўму праз страту блізкіх. Зразумець, як яны маглі гэта вытрымаць, дапамагае праца з паняццем рэзільентнасці.

Настаўнік можа напісаць вызначэнне на дошцы або раздаць на сталы для групавой працы. На прыкладзе лёсу Алены Драпкінай клас паспрабуе паказаць, як яна пераадольвала тыя цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на яе долю. Для гэтага навучэнцы ў групах знаёмяцца з яе біяграфіяй, храналогіяй жыцця, урыўкамі ўспаміну (гл. **ДАДАТАК 1**). Затым выконваюць наступныя заданні.

### ЗАДАННЕ 1.
Вызначце, якія этапы ў біяграфіі Алены Драпкінай падыходзяць пад вызначэнне цяжкіх перыядаў. Падмацуйце іх цытатамі з успамінаў у дадатку, апішыце, як сведка ваенных падзей іх пераадольвала.

### ЗАДАННЕ 2.
На аснове ўрыўкаў успамінаў паспрабуйце выказаць здагадку: чаму Алена далучылася да партызанаў? Як вы лічыце, ці дапамагло гэта пераадолець яе траўму страты блізкіх?

### ЗАДАННЕ 3.
Пракаментуйце, чаму першы выпадак сур’ёзнага стрэсу і яго пераадолення прыпадае на вайну.

(*Прыблізны адказ:* гібель сям’і стала зыходным пунктам рэзкага сталення 17-гадовай дзяўчыны, якая пачынае самастойна спрабаваць забяспечыць сваё існаванне і выжыванне.)

Пасля выканання заданняў у групах выбіраюць асноўных прэзенцёраў адказаў. Кожнай з груп даецца магчымасць пераважнага паведамлення па адным з заданняў. Астатнія дапаўняюць.

**ЧАСТКА ІІ.**
## ГЕРОІ ДРУГОГА ПЛАНА
(10 ХВ)

Падчас вайны людзі, якія трапілі пад акупацыю, маглі выбіраць розныя стратэгіі паводзін. Былі тыя, хто станавіліся ахвярамі, і тыя, хто быў памагатым нацыстаў. Большасць знаходзілася на пазіцыі назіральнікаў за падзеямі (*настаўнік паказвае навучэнцам схему, пададзеную ніжэй).* Ад іх індывідуальнага выбару залежала перавага “шаляў” на бок пацярпелых або злачынцаў. У тым ліку гэта ў сукупнасці ўплывала і на вялікія падзеі, на зыход вайны.




Навучэнцам рэкамендуецца пачытаць урыўкі ўспаміну Алены пра тых, хто ёй дапамагаў (гл. **ДАДАТАК 2**), а затым выканаць наступнае

ЗАДАННЕ: паспрабаваць паразважаць, чаму выратавальнікі Алены рабілі гэта, нягледзячы на пагрозу смерці.

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ
(2 ХВ)

Настаўнік падводзіць вынікі дыскусіі і робіць кароткае рэзюмэ ўрока.

*Ірына Кашталян*

## ДАДАТАК 1

# Урыўкі з успаміну да часткі І. Алена Драпкіна і яе пераадоленне траўмы

## ПРА СТАН ПАСЛЯ ГІБЕЛІ СЯМ'І

Усіх маіх сваякоў вывезлі за межы Мінска і расстралялі. Цяпер я не магу ўявіць, як я вытрымала гэтае катаванне, якое доўжылася дзень. Я ўдзячная старэйшаму брату таты за тое, што ён папярэдзіў нас аб аблаве і ў мяне было дастаткова часу для таго, каб схавацца і выжыць.

## ПРА РАШЭННЕ СЫСЦІ З ГЕТА

З сакавіка 1942 г. быў страшны пагром; на складзе нам сказалі, што ў гета — моцны пажар. Мы папрасілі намесніка нашага шэфа, старога, не везці нас пасля працы ў гета, але ён сказаў, што не можа. Калі мы пад'ехалі, нас вышнуравалі ў шэраг каля ўваходу ў гета. Мы былі акружаныя ўзброенай аховай, і ўцячы было немагчыма. Было некалькі ачапленняў, і ля кожнага немец правяраў дакументы. У мяне быў працоўны пропуск. Немцы сартавалі людзей па групах. Усё гэта вельмі доўга працягвалася, надышла ноч, было холадна, ярка свяціла поўня. Было дзесьці 3 гадзіны раніцы. У першай групе сабралі гамбургскіх яўрэяў (яны трымаліся за рукі). Я падышла да іх і прайшла, узняўшы іх рукі. Я ішла ў бок гета. Наступнымі стаялі палякі, і я прайшла і праз іх. Я падышла да немца, які правяраў дакументы, і атрымала па галаве бізуном; тым не менш немец прапусціў мяне ў гета, і я далучылася да групы нашых мужчын, з якімі мы працавалі. Адзін з іх спытаў мяне пра дачку, але я нічога пра яе не ведала. Нарэшце немцы скамандавалі: «Па дамах!» На заўтра на працу на склад прыехалі ўсе нашы мужчыны, а з дзяўчат — толькі дзве, у тым ліку я... Пасля гэтага я зразумела, што трэба сыходзіць. Але як?

Разам са мной на складзе працавалі электрыкі Чэхаўскі і Віктар (рускія). Яны ненавідзелі немцаў. Аднойчы да мяне падышоў Чэхаўскі і сказаў: «Лена, мы дамо табе рускі пашпарт; спадзяюся, ты не выдасі нас». Я паабяцала. Я дала ім свой фотаздымак, а яны ад рукі ў пашпарце зрабілі пячатку на ім. Мой пашпарт быў на імя Скроцкай Ядвігі, полькі 1920 г. нараджэння. Я атрымала пашпарт у красавіку і чакала зручнага моманту для ўцёкаў з гета. 28 ліпеня 1942 г. [у гета] пачаўся страшны пагром, які працягваўся некалькі дзён. Пасля гэтага пагрому мне ўдалося выбрацца з Мінска. Мы ішлі пешшу з 6 раніцы да позняй ночы (нешта каля 50 кіламетраў). Гэта было ў ліпені. Цяпер я нават не ўяўляю, як я гэта вытрымала. На выхадзе з горада ў нас праверылі дакументы: пашпарт на імя Скроцкай і даведку (яе мне зрабіла нямецкая яўрэйка, якая працавала ў нашага начальства).

## ПРА РАШЭННЕ ПАЙСЦІ Ў ПАРТЫЗАНЫ

Я пражыла ў іх каля месяца; аднойчы я засталася адна дома з дзецьмі, а Павел з жонкай з'ехалі ў суседнюю вёску на пахаванне. Раптам прыбегла Ніна і закрычала: «А да нас ідуць партызаны!» Я пабегла ў хату, схавалася за шафу. Чую, як партызаны пытаюцца ў дзяцей пра бацькоў. Ніна распавяла партызанам, што бацькі з'ехалі на пахаванне, і дадала: "А ў нас ёсць дзяўчына!»

У гэты момант я зразумела, што няма сэнсу хавацца, і выйшла з-за шафы. Іх было 5 чалавек. У мяне зноў спыталі дакументы. Камандзір праверыў прапіску, дзе было пазначана, што я прапісаная ў пасёлку Камінтэрн у ваколіцах Мінска (у рэальнасці гэта было досыць далёка ад майго месца жыхарства). Камандзір сказаў, што мы з ім былі суседзямі. Ён стаў задаваць мне пытанні, на якія я не ведала адказаў. Я прызналася, што я — яўрэйка і што я ўцякла з гета. Я стала прасіць іх, каб яны забралі мяне з сабой: так як яны раскрылі мяне, я не ведала, што мне сказаць гаспадару. Сярод партызан быў адзін яўрэй [Алена Драпкіна назвала яго «аід» на мове ідыш]. Камандзір звярнуўся да дзяцей, каб яны перадалі бацьку: дзяўчына павінна жыць на хутары, пакуль не прыйдуць партызаны і не забяруць яе.

Мне ён сказаў, што цяпер яны ідуць на заданне, а на зваротным шляху паабяцаў за мной зайсці і дадаў, што калі мяне не будзе, то яны спаляць хутар. І яны сышлі... Я пражыла ў іх яшчэ месяц. Ніхто не прыйшоў.

Раптам туды ў лес (побач з хутарам) прыляцела маскоўская дэсантная група. Іх было 8 чалавек. Яны прыйшлі на хутар, і я ім сказала, што я хачу ў партызанскі атрад, хачу адпомсціць за ўсіх маіх загінулых родных, бо я засталася адна. Яны паабяцалі забраць мяне. Так я трапіла ў маскоўскую дэсантную групу ў верасні-кастрычніку 1942 г., і з гэтага часу па ліпень 1944 г. я была ў партызанах.

## ПРА ПЕРАЕЗД У ЛЕНІНГРАД

У Мінску хутка наладжвалася мірнае жыццё, у мяне была добрая праца. Мне ж было вельмі цяжка хадзіць па вуліцах горада, у якім былі забітыя мае бацькі, мой брацік (усе мае сваякі). Сястра маёй мамы цётка Маня (нават больш, чым сястра: блізнюк маёй мамы) жыла з сям'ёй у Ленінградзе і выжыла ў блакадзе. Я пераехала ў Ленінград і паступіла ў зубалячэбную школу. Было гэта ў 1945 г.



ПЕРШЫ МУЖ АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ ВУЛЬФ І ЯГО БРАТ БАРЫС (ЛЕНІНГРАД, СССР, 1938)

## ДАДАТАК 2

## Урыўкі з успаміну да часткі ІІ. Героі другога плана

1. Разам са мной на складзе працавалі электрыкі Чэхаўскі і Віктар (рускія). Яны ненавідзелі немцаў. Аднойчы да мяне падышоў Чэхаўскі і сказаў: «Лена, мы дамо табе рускі пашпарт; спадзяюся, ты не выдасі нас». Я паабяцала. Я дала ім свой фотаздымак, а яны ад рукі ў пашпарце зрабілі пячатку на ім. Мой пашпарт быў на імя Скроцкай Ядвігі, полькі 1920 г. нараджэння. Я атрымала пашпарт у красавіку і чакала зручнага моманту для ўцёкаў з гета. 28 ліпеня 1942 г. [у гета] пачаўся страшны пагром, які працягваўся некалькі дзён. Пасля гэтага пагрому мне ўдалося выбрацца з Мінска. Потым я сустрэла Віктара ў партызанскім атрадзе: як аказалася, ён і Чэхаўскі былі сувязнымі партызанскага атрада.

2. Са мной працавала руская дзяўчына Лена. Я папрасіла яе вывесці мяне з Мінска... Окця распавядала нам, што ў Заходняй Беларусі, на тэрыторыі былой Польшчы, можна было лёгка знайсці працу: там патрабаваліся жанчыны для работ у полі. У Лены там жыла сястра, і таму я папрасіла яе вывесці мяне за межы Мінска. Яна пагадзілася.

У 6 раніцы я выйшла з гета ў калоне рабочых. Лена чакала мяне недалёка ад мяжы гета. Калону канваяваў адзін нямецкі салдат; я непрыкметна выйшла з калоны і сустрэлася з Ленай. Я зняла пінжак з жоўтымі латамі, і мы пайшлі да Лены дадому. Яна зачыніла мяне і пайшла на працу. Увечары яна вярнулася, мы пераначавалі, а назаўтра рана раніцай мы з ёй выйшлі з горада і накіраваліся да яе сястры. Мы ішлі пешшу з 6-й раніцы да позняй ночы (нешта каля 50 км). Гэта было ў ліпені. Цяпер я нават не ўяўляю, як я гэта вытрымала. На выхадзе з горада ў нас праверылі дакументы: пашпарт на імя Скроцкай і даведку (яе мне зрабіла нямецкая яўрэйка, якая працавала ў нашага начальства). Мы прыйшлі позна ўначы да Ленінай сястры, нас накармілі, і мы ляглі спаць. Лена спала ў хаце, а мяне адправілі ў адрыну. Раніцай мы паснедалі, пасля Леніна сястра запрэгла каня. Мы выехалі, яна паказала мне дарогу і лес, праз які я павінна была ісці ў Заходнюю Беларусь.

3. Я падзякавала, але папрасіла старога паказаць мне дарогу. Ён пагадзіўся, і нейкі час мы ішлі разам. Раптам ён спытаў у мяне, ці не яўрэйка я? Я сказала, што так. Ён папярэдзіў мяне: «Ніколі нікому не кажы, што ты — яўрэйка. Паказвай пашпарт і маўчы». І я пайшла далей адна.

Між іншым, з усімі, хто мне дапамагаў, я пасля сустрэлася. З гэтым старым я сустрэлася выпадкова, калі я патрапіла на яго хутар у складзе групы партызан; ён мне распавёў, што тых двух мужчын, якіх я бачыла ў яго тады, потым забілі немцы.

4. Калі гаспадары хутара вярнуліся дадому, іх дачка ім усё распавяла. Яе бацька адказаў, што ён здагадваўся пра тое, што я — яўрэйка. Я чула іх размову. Тады гаспадар папрасіў мяне расказаць усё падрабязна пра сябе і, у прыватнасці, назваць сапраўднае імя. Гаспадыня тут жа сказала, што і ў яе былі падазрэнні, так як я не заўсёды адгукалася на сваё імя.

Я расказала ім усё, і гаспадар здзівіўся таму, што ў мяне валасы былі прамыя і я не картавіла. Я пражыла ў іх яшчэ месяц.

## **ТЭМА ЗАНЯТКУ:** ПЕРАМАГЛА ВАЙНУ: ЛЁС ЖАНЧЫНЫ ПАДЧАС ВАЙНЫ

| | |
|---|---|
| МЭТАВАЯ ГРУПА | навучэнцы ад 16 гадоў. |
| ПРАЦЯГЛАСЦЬ | 90 хв (медыяаналіз фотаздымкаў (10 хв), праца з бачнымі групамі і прагляд фільма (15 хв), афармленне плакатаў (25 хв), прагляд і абмеркаванне фільма (10 хв), аповед настаўніка і прэзентацыя работы мікрагруп (15 хв), рэфлексія (5 хв) + праца ў мікрагрупах у трох частках урока (10 хв). |
| МЭТА | вывучэнне ідэнтычнасці і лёсу жанчыны, якая перажыла вайну, на прыкладзе гісторыі Алены Драпкинай. |
| ЗАДАЧЫ | - пазнаёміцца з гісторыяй жыцця Алены Драпкінай;<br>- прааналізаваць уплыў ваенных падзей на лёс, жыццёвыя прыярытэты і каштоўнасці Алены Драпкінай, а затым — жанчын ва ўмовах вайны ў цэлым;<br>- зрабіць выснову пра трансфармацыю сацыяльных роляў жанчыны да, падчас і пасля вайны. |
| ФОРМЫ ПРАЦЫ | франтальная, групавая, індывідуальная. |
| МЕТАДЫ | бліц-апытанне, эўрыстычная гутарка, рашэнне праблемных сітуацый, інтэрактыў, дыскусія, прэзентацыя. |
| МАТЭРЫЯЛЫ | фільм пра Алену Драпкіну, фотаздымкі і фрагменты яе біяграфіі, піраміда Дзілтса. |
| МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ | Пасля вывучэння кожнага з этапаў жыцця Алены навучэнцы спрабуюць вызначыць яе ідэнтычнасць у пэўны перыяд жыцця, вылучаючы ўнутраныя і знешнія фактары, якія паўплывалі на дзяўчыну. У якасці апоры для выканання гэтага задання рэкамендуецца выкарыстоўваць піраміду Дзілтса (гл. **ДАДАТАК 1**), дзе пад умоўнай місіяй чалавека будзем разумець жыццёвыя каштоўнасці і прыярытэты Алены Драпкінай. На працягу ўрока плануецца тройчы вызначаць асобасную ідэнтыфікацыю галоўнай гераіні, для чаго настаўнік у пачатку занятку арганізуе тры рабочыя групы (гэта можа быць як дзяленне ўсяго класа на групы, так і вызначэнне трох мікрагруп па 3–4 чалавекі з найбольш актыўных вучняў):<br><br>1-я — ідэнтычнасць Алены ў даваенны час;<br>2-я — у перыяд знаходжання ў гета;<br>3-я — падчас удзелу ў партызанскім руху.<br><br>4-я ідэнтычнасць Алены Драпкінай — на момант заканчэння вайны — вызначаецца ў ходзе сумеснага абмеркавання (міні-дыскусіі). Тут жа важна правесці аналіз унутрыасобасных пераўтварэнняў, якія адбыліся з Аленай, а праз яе прыклад — са зборным вобразам жанчыны на вайне.<br><br>Падчас працы мікрагруп (3–4 хв) настаўнік уключае тэматычную музыку (напрыклад, Schindler's List — John Williams), арганізуючы магчымасць самастойных разважанняў навучэнцаў пра пачутае. |

**ЧАСТКА I.**
## КЛЮЧАВОЕ ПЫТАННЕ: ЯК ЧАЛАВЕКА ЗМЯНЯЕ ВАЙНА?
(10 ХВ)

**КЛЮЧАВОЕ ПЫТАННЕ**

**пытанне праблемнага характару. Абавязкова мае эмацыйную афарбоўку для таго, хто шукае на яго адказ, і сацыяльнае значэнне.**

Вучням прапануецца разгледзець дзве фатаграфіі — Алены да і ў час вайны (гл. **ДАДАТАК 2**) — і паразважаць над наступнымі пытаннямі:

- у якія гады зробленыя фатаграфіі
- які вобраз маладой дзяўчыны малюе нам кожнае з фота (пацвердзіце сваё меркаванне праз аналіз адзення, прычоскі, погляду, розных атрыбутаў, прадстаўленых на фота);
- што ўяўляла сабою жыццё жанчыны ў гэты час (яе штодзённая руціна, заняткі, інтарэсы, думкі, жыццёвыя каштоўнасці);
- ці можна казаць, што на фотаздымках мы бачым:
  а) аднаго і таго ж чалавека;
  б) двух розных людзей.

**ЧАСТКА II.**
## ЖЫЦЦЁ ДА ВАЙНЫ
(15 ХВ + ДА 4 ХВ ДЛЯ МІКРАГРУПЫ)

**ПРЫЁМ «БАЧНЫЯ ГРУПЫ»**

**Настаўнік праводзіць з навучэнцамі бліц-апытанне. Навучэнцы становяцца ў кола і пры кожнай згодзе на пытанне настаўніка робяць крок наперад (да цэнтра), пры адмоўным адказе застаюцца на месцы. Такім чынам, мы робім групы бачнымі, г.зн. навочна дэманструем, што ў нас, а пасля працы з фільмам — і з галоўнай гераіняй — шмат агульнага (жыццё «звычайных» людзей).**

**Калі ў кабінеце няма магчымасці стварыць кола, пры станоўчым адказе можна ўздымаць руку або ўставаць з-за партаў.**

**Пытанні для бліца:**

**хто з вас нарадзіўся ў Мінску;**
**у каго бацькі працуюць настаўнікамі або выкладчыкамі, бухгалтарамі;**
**у каго з вас ёсць старэйшы брат, малодшы брат;**
**а хто жыве ў шматдзетнай сям’і;**
**хто хацеў бы быць лекарам, лекарам-стаматолагам;**
**хто любіць тэатр;**
**у каго ёсць сапраўдны сябар ці сяброўка;**
**хто захапляецца / займаецца плаваннем,**
**у каго ёсць спартыўныя ўзнагароды;**
**ці лічыце вы сваё жыццё шчаслівым?**

Настаўнік адзначае, як шмат агульнага паміж усімі, а затым прапануе пазнаёміцца з адказамі на гэтыя ж пытанні Алены — дзяўчыны-аднагодкі навучэнцаў, з той толькі розніцай, што нарадзілася яна фактычна стагоддзе таму. Менавіта яе вачыма, праз прызму лёсу маладой дзяўчыны, настаўнік прапануе зірнуць на падзеі сярэдзіны мінулага стагоддзя.

ПРАГЛЯД ФІЛЬМА — 00:01–02:59.
Праца першай мікрагрупы з пірамідай Дзілтса па ідэнтычнасці Алены Драпкінай (не больш за 4 хв).

МЕРКАВАНЫ ВЫНІК:
ідэнтычнасць 1. Маладая дзяўчына.

**ЧАСТКА III.**
## ПАЧАТАК ВАЙНЫ. ЖЫЦЦЁ Ў ГЕТА
(25 ХВ + ДА 4 ХВ ДЛЯ МІКРАГРУПЫ)

Навучэнцы знаёмяцца з *гістарычным матэрыялам* (дакумент пра стварэнне гета (гл. **ДАДАТАК 3**), успамінам Алены пра жыццё ў гета (гл. **ДАДАТАК 4**) + гістарычны кантэкст з брашуры пры неабходнасці), а затым запаўняюць два агульныя плакаты для ўсяго класа: першы — мэты нацысцкіх злачынцаў пры арганізацыі гета, другі — мэты вязняў, якія міжволі апынуліся ў гета.

Магчымы варыянт афармлення плакатаў:

**ПЛАКАТ 1**

- Эканамічныя (прымусовая праца, канфіскацыі і г.д.);
- Палітычныя (расавая ідэалогія нацыстаў);
- Антыгуманістычныя (пазбаўленне чалавека ўсяго чалавечага — свабоды, годных умоў жыцця, недатыкальнасці асобы і г.д.)

**ПЛАКАТ 2**

Выжыць

Пасля завяршэння афармлення плакатаў пачынае працу другая мікрагрупа па вызначэнні ідэнтычнасці Алены Драпкінай.

МЕРКАВАНЫ ВЫНІК:
ідэнтычнасць 2. Вязень, «чалавек-невідзімка».

**ЧАСТКА IV.**
## СУПРАЦІЎ І ВЫЗВАЛЕННЕ
(10 ХВ + ДА 4 ХВ ДЛЯ МІКРАГРУПЫ)

ПРАГЛЯД ФІЛЬМА — 06:21–08:45.

Навучэнцы разважаюць над пытаннем: як Алена супраціўлялася нацысцкаму рэжыму і колькі відаў супраціву можна вылучыць у яе гісторыі?

- Уцёкі з гета.
- Узброеная барацьба ў шэрагах партызан.
- Не зламаны дух дзяўчыны.

Па заканчэнні абмеркавання арганізуецца праца трэцяй мікрагрупы.

МЕРКАВАНЫ ВЫНІК:
ідэнтычнасць 3. Ваенны чалавек, салдат, баец.

**ЧАСТКА V.**
## ЯК ВАЙНА ЗМЯНІЛА АЛЕНУ?
(15 ХВ)

Настаўнік вяртаецца да ПЫТАННЯЎ З БЛІЦА, агучаных у другой частцы ўрока. Цяпер навучэнцы адказваюць на іх ужо з пазіцый Алены Драпкінай 1945 г. Гэта дазволіць наглядна прадэманстраваць, як змянілася жыццё Алены.

Потым увага навучэнцаў фікусуецца на КЛЮЧАВЫМ ПЫТАННІ да ўрока:
- як і чаму змяніліся адказы Алены?
- на колькі гадоў пасталела дзяўчына? (Ці дастатковы адказ «на 4 гады»?)
- як чалавека змяняе вайна?

АПОВЕД НАСТАЎНІКА пра вынікі Другой сусветнай вайны для беларускага народа: чалавечыя страты (у тым ліку страты сярод яўрэйскага насельніцтва краіны), стан гарадоў і вёсак, героі і ахвяры вайны.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ВЫНІКАЎ ПРАЦЫ МІКРАГРУП, фарміраванне шэрагу магчымых трансфармацый ідэнтычнасці Алены Драпкінай: дзяўчына — вязень — баец.

Навучэнцы абмяркоўваюць:
- Алена Драпкіна — гераіня ці ахвяра вайны?
- Ці можа герой быць ахвярай, ахвяра — героем?
- Якія звыклыя сацыяльныя ролі жанчын змяніліся ва ўмовах ваенных дзеянняў і акупацыі? Як гэта паўплывала на іх светаадчуванне і самаўспрыманне ў далейшым жыцці?

**ЧАСТКА VI.**
КВЕТКІ ДЛЯ АЛЕНЫ ДРАПКІНАЙ
(5 ХВ)

Урок заканчваецца ЭМАЦЫЙНАЙ І ЗМЯСТОЎНАЙ РЭФЛЕКСІЯЙ. Навучэнцам прапануецца падарыць Алене рукатворную кветку. Настаўнік замацоўвае на дошцы бутон, а навучэнцы — пялёсткі да яго: на адным баку — слова, з якім, як яны мяркуюць, у Алены Драпкінай асацыюецца вайна (што яна часцей за ўсё ўспамінала / прамаўляла, кажучы пра вайну), на другой — пажаданні Алене, дзяўчыне, якая перажыла вайну.

ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ:

- для зацікаўленых гісторыяй Алены Драпкінай — даглядзець біяграфічны фільм і вызначыць пасляваенную ідэнтычнасць Алены (ці з’явіцца новая ідэнтычнасць / сыдуць або зменяцца ранейшыя);
- для зацікаўленых лёсам жанчыны на вайне — прачытаць кнігу (фрагменты кнігі) С. Алексіевіч «У вайны не жаночы твар» і стварыць сінквейн / напісаць эсэ «Жанчына на вайне».

*Дар’я Касякова*

## ДАДАТАК 1

Піраміда Дзілтса



## ДАДАТАК 2

## Фотаздымкі Алены Драпкінай





## ДАДАТАК 3

## Гістарычны дакумент «Загад аб стварэнні гета ў Менску»

Менск, 20 ліпеня 1941 г.

**З А Г А Д**
**НА ЎТВАРЭНЬНЕ ЖЫДОЎСКАГА ЖЫЛОГА РАЁНУ Ў г. МЕНСКУ**

1. Пачынаючы ад даты гэтага загаду, у горадзе Менску будзе вылучана асобная частка гораду выключна на пражываньне жыдоў.
2. Усё жыдоўскае жыхарства гораду Менску абавязана пасьля агалошаньня гэтага загаду на працягу 5-цёх дзён перабрацца ў жыдоўскі раён. Калі хто з жыдоў пасьля скачэньня гэтага тэрміну будзе знойдзены ня ў гэтым жыдоўскім раёне, ён будзе арыштаваны і як найстражэй пакараны. Няжыдоўскае жыхарства, што жыве ў межах жыдоўскага жылога раёну, мае безадкладнейшым чынам пакінуць жыдоўскі раён. Калі вызваленых жыдамі памяшканьняў ня ў жыдоўскім раёне не акажацца, Аддзел Прыдзелу Памешканьняў Менскай Гарадзкой Управы адвядзе іншыя вольныя памешканьні.
3. Дапушчаецца браць з сабою хатнюю маёмасьць. Хто будзе злоўлены на забіраньні чужога дабра або рабаваньні, будзе карацца праз расстрэл.
4. Жыдоўскі раён абмяжоўваецца наступнымі вуліцамі: Калгасны завулак з прыляганьнем Калгаснай вуліцы, далей паўз рэчку з прыляганьнем Нямігскай вуліцы, выключаючы праваслаўную царкву, з прыляганнем да Рэспубліканскай вуліцы, з прыляганьнем Шорнай вуліцы, Калектарнай вуліцы, Мэбэльнага завулку, Перакопскай вуліцы, Нізавой вуліцы, Жыдоўскіх могілак, Абутковай вуліцы, Другога Апанскага завулку, Заслаўскай вуліцы аж да Калгаснага завулка.
5. Жыдоўскі жылы раён мае быць зараз-жа пасьля скачэньня пярэбараў агароджаны каменным мурам ад рэшты гораду. Мураваньне гэтага муру мусіць быць зроблена жыхарамі жыдоўскага раёну, прычым за будаўляны матар'ял будзе каменьне з няжылых або зруйнаваных будынкаў.
6. Бытаваньне ня ў жылым жыдоўскім раёне жыдам, зграмаджаным у рабочыя жыдоўскія дружыны, ёсьць забаронена. Гэтыя дружыны могуць выйсьці з свайго раёну толькі маючы накіраваньне на пэўныя месцы працы, вызначаныя Менскай Гарадзкой Управай. Парушэньні гэтага загаду будуць карацца праз расстрэл.
7. Жыдам дазволена ўваходзіць і выходзіць з жыдоўскага раёну толькі дзьвюма вуліцамі: Апанскай і Астроўскай. Пералазіць праз мур забараняецца. Нямецкай варце і варце службы парадку загадана страляць у парушальнікаў гэтага.
8. У жыдоўскі жылы раён могуць уваходзіць адны толькі жыды і асобы, якія належаць да нямецкіх вайсковых фармаваньняў і да Гарадзкой Менскай Управы і толькі на выпадак справы.
9. На Жыдоўскую Раду ўскладзена пазыка 30.000 чырвонцаў на ўзнаўленьне выдаткаў, зьвязаных з гэтымі пярэбарамі. Гэтыя грошы, процантная аплата якіх пазьней будзе ўрэгулявана, павінны быць зложаны на працягу 12 гадзін пасьля выданьня гэтага загаду ў касу Гарадзкой Управы (вуліца Карла Маркса, 28).
10. Жыдоўская рада зараз-жа павінна даць Аддзелу прыдзелу памешканьняў Гарадзкой Управы заяву пра ўсё жыдамі пакінутыя памешканьні, якія знаходзяцца ня ў жыдоўскім раёне і яшчэ не занятыя арыйскім (няжыдоўскім) жыхарствам.
11. Парадак у жыдоўскім жылым раёне будуць трымаць асобныя жыдоўскія дружыны парадку (адмысловы загад на гэта будзе сваім часам).
12. За канчатковыя пярэбары жыдоўскіх жыхароў у іхні раён поўную адказнасьць мае Жыдоўская Рада горада Менску. Усялякія парушэньні гэтага загаду будуць як найстражэй пакараны.

Палёвы камэндант

## ДАДАТАК 4

# Фрагмент успаміну Алены Драпкінай пра пачатак вайны і жыццё ў гета

У 1941 г. я скончыла 9 класаў. У чэрвені пачалася вайна. На другі дзень бамбілі Мінск і затым у горад увайшлі войскі. 24 чэрвеня была страшная бамбёжка Мінска. У нас быў сусед Шура Багдановіч, у яго жонка была яўрэйка — Дора, у іх было двое маленькіх дзяцей. Шура прыехаў на машыне, забраў сваю сям'ю, Дорыных бацькоў, Ляўковічаў, нашу сям'ю і сям'ю Баравых. Мінск гарэў, было вельмі дымна, і ён адвёз нас ад пажарышча, як аказалася — насустрач немцам. Трэба было выбіраць, каб выбрацца з Мінска, з дыму. Мы прыехалі ў Астрашыцкі Гарадок, дзе былі дзён 10, там ішлі страшныя баі, а потым прыйшлі пешшу назад у Мінск.

Наш дом разбамбілі. Каля Шырокай вуліцы быў ваенны шпіталь, там расклалі палатно з чырвоным крыжам, думалі, што немцы, як цывілізаваныя людзі, шпіталь не будуць бамбіць, а яны выкарыстоўвалі крыж у якасці мішэні і разбамбілі шпіталь.

Немцы ўвайшлі ў горад і напісалі, што ўсе яўрэі павінны сабрацца ў адзін раён, і паказалі ў які. Тыя яўрэі, якія жылі ў раёне, паказаным немцамі, заставаліся ў сваіх дамах, а рускія павінны былі выехаць з гэтага раёна, пачаліся абмены жылля. Наш дом адышоў да рускай часткі вуліцы. Памяняць мы ўжо не паспелі, а ў гета жыў малодшы татаў брат дзядзька Толя, у яго быў маленькі пакой, 14 квадратных метраў, і маленечкая кухня, 5 квадратных метраў, на першым паверсе, яны там жылі ўтрох: цётка Рахіль, іх сын Міша і дзядзька Толя. У такім жа становішчы апынуўся і старэйшы брат таты. Увогуле ўсе тры браты з сем'ямі аказаліся ў гэтым маленечкім пакойчыку, нас было 9 чалавек.

Пакуль гета не было абнесена дротам, мы яшчэ неяк выходзілі, хоць гэта забаранялася. Жыць можна было толькі на тэрыторыі гета. Першы час выходзілі, каб даставаць нейкія прадукты. Картак у нас не было. Калі нас абнеслі калючым дротам, арганізавалі біржу працы і людзі пайшлі туды, у тым ліку пайшлі я, тата. Тата адразу загінуў. Першая аблава была 14 жніўня 1941 г., другая аблава была 28 жніўня. 28 жніўня тата выйшаў на вуліцу і ўсё. Тату забралі.

20 лістапада 1941 г. раніцай я яшчэ ляжала ў ложку. Я спала на стале, так як у пакоі было вельмі цесна. Старэйшы татаў брат быў вельмі набожны чалавек, і як я цяпер разумею, там яўрэі арганізавалі малельны дом. Раніцай ён хацеў туды пайсці, але яго не выпусцілі з брамкі рускія паліцыянты. Сярод паліцэйскіх былі ўкраінскія і літоўскія легіёны. Мы ўсё зразумелі, бо 7 лістапада загінуў дзядуля з цёткай. Я адразу ж ускочыла, нешта на сябе накінула і кінулася пад лесвіцу, якая вядзе на другі паверх. Там мужчыны зрабілі так званую «маліну», прастору, зашытую бляхай і завешаную і анучамі. Я паспела ўскочыць у гэтую маліну. Там ужо было поўна народу, за мной туды яшчэ паспеў ускочыць сын дзядзькі Толі — Міша. Немцы заходзілі ў дамы, прачэсвалі пакоі і ўсіх выводзілі. Там мы прасядзелі (прастаялі) суткі, сярод нас была жанчына з маленькім дзіцем, і мы ўсе баяліся, каб дзіця не заплакала, і чулі ўсё, што адбывалася вакол, як ходзяць па лесвіцы, як мама казала: «Адну хвілінку, я паліто апрану». Іх павезлі пад Мінск і там расстралялі. Я не магу сабе ўявіць, як я магла ўсё гэта вытрымаць на працягу сутак.

Потым у гэты раён прывезлі гамбургскіх яўрэяў з Германіі і пасялілі іх у дамы яўрэяў, якіх да таго часу ўжо знішчылі. Пазней, калі мы з імі разгаварыліся, яны расказвалі, што ім казалі, што іх вязуць у Палестыну, а прывезлі ў Мінск. Яны былі ў трансе, калі даведаліся, што іх прывезлі ў Расію.

Праз дзень я пайшла на біржу працы, мяне ўзялі на працу на галоўны склад чыгункі, там было вялікае памяшканне, куды прывозілі з Германіі мыла, мыльная парашок, мяцёлкі і іншыя тавары. Нас было 19 дзяўчат, мы павінны былі разгружаць і загружаць вагоны. Прывозілі і везлі нас на працу на машыне, так як склад быў далёка ад гета. Жылі мы ў гета, каля могілак. Многія яўрэі працавалі, кожны дзень на працу да генерал-камісара горада з гета ішла вялікая калона. Так я засталася там працаваць і працавала з канца восені і ўсю зіму. Жыла я ў пакоі са стрыечным братам Мішам і з чужым пажылым чалавекам і яго сынам.

3 сакавіка 1942 г. быў страшны пагром. Пасля гэтага я зразумела, што трэба неяк уцякаць. Але як? Разам са мной на складзе працавалі электрыкі Чэхаўскі і Віктар. Яны былі рускія, але немцаў ненавідзелі.
На складзе да мяне падышоў Чэхаўскі і сказаў: «Лена, мы табе дамо рускі пашпарт, але ты нас не выдасі?» Я прынесла сваю фатаграфію, а яны ад рукі ў пашпарце зрабілі пячатку на маёй фатаграфіі. Мне далі пашпарт на імя Ядвігі Аляксандраўны Скроцкай 1920 г. нар., полькі, але з маёй фатаграфіяй. Пашпарт у мяне быў, але сысці я не магла і жыла з гэтым пашпартам з красавіка. 28 ліпеня 1942 г. пачаўся страшны пагром, і ён працягваўся некалькі дзён. Пасля гэтага пагрому я выйшла з Мінска.

## АЎТАРЫ-СКЛАДАЛЬНІКІ МАТЭРЫЯЛАЎ


| | |
|---|---|
| ІРЫНА БЕРНАТ | настаўніца гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Гімназія № 36 г. Мінска», кваліфікацыйная катэгорыя — настаўнік-метадыст. |
| ТАЦЦЯНА ГАЙДУК | настаўніца гісторыі і грамадазнаўства першай кваліфікацыйнай катэгорыі; экскурсавод. |
| ЛЮДМІЛА ГУРЫНОВІЧ | настаўніца гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Белавежская сярэдняя школа» Камянецкага р-на Брэсцкай вобл., вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя. |
| ІРЫНА КАШТАЛЯН, PH.D. | гісторык, кіраўніца праекта «Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна» Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ёханэса Рау (2018-2021), спецыяліст па адукацыйных праграмах. |
| ДАР’Я КАСЯКОВА | выкладчыца гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, настаўніца гісторыі і грамадазнаўства першай кваліфікацыйнай катэгорыі. |
| ЛІДЗІЯ НАЛІЎКА | карэктар |
| МІКЛАС ФЕКАТЭ, КСЕНІЯ ШТАЛЕНКОВА | дызайнеры |
| ФАБІЯН РУЛЕ | дырэктар па еўрапейскай адукацыі ў CENTROPA |
| НІНЬЯ ШТЭР | каардынатарка праекта пра Алену Драпкіну ў CENTROPA |

# ЗМЕСТ

3 Прадмова

ЧАСТКА I.
**МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПРАЦЫ З ФІЛЬМАМ ПРА АЛЕНУ ДРАПКІНУ**

5 Біяграфія сведкі ваенных падзей
6 Асобы, якія згадваюцца ў фільме
7 Структура фільма
8 Кароткі гістарычны кантэкст
12 Храналогія гістарычных падзей і жыцця гераіні фільма

ЧАСТКА II
**ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЗАНЯТКАЎ**

14 Рэкамендацыі па выкарыстанні матэрыялаў
15 Бернат І. Сям’я
20 Гайдук Т. Яўрэі Мінска першай паловы ХХ ст.: традыцыйнае жыццё і саветызацыя
28 Гурыновіч Л. Біяграфія асобы як частка гісторыі
32 Кашталян І. Перажыць немагчымае
36 Касякова Д. Перамагла вайну

42 Аўтары-складальнікі